

ЁН СТАЎ КІРАЎНІКОМ У 28 ГАДОЎ 6

АДТЭРМІНОЎКА ПА СЯМЕЙНЫХ АБСТАВІНАХ? 10



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. СЕРАДА № 205 (28821)

### ЛІЧБА ДНЯ

**38 %**

*уведзенага ў студзені — верасні жылля пабудавана для маючых патрэбу, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. У студзені — верасні арганізацыі ўсіх формаў уласнасці пабудавалі 29,3 тыс. кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 2,536 млн кв. м агульнай плошчы жылля. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 964,3 тыс. кв. м. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 742,1 тыс. кв. м агульнай плошчы жылля (29,3 % ад агульнага ўводу па краіне).*

# Залатая, дзякуй, што была!



Фота БелТА.

За акном дождж і вецер, а ў душы ўсё яшчэ яна — сёлетняя залатая восень. Яна будзе згадвацца шчаслівымі непаўторнымі імгненнямі і гэтым дзяўчатам, што фатаграфаваліся на днях у Нясвіжскім парку, і гераіням сённяшняй рубрыкі «Фота на трынаццатую». Мы сабралі ўсю чароўнасць і прыгажосць гэтай дзівоснай восені, каб нават шэрым дажджлівым днём у вас на душы стала святлей і спакайней ад добрай згадкі пра яе.

### КОРАТКА

- **З 1 лістапада ў Беларусі працоўныя пенсіі ў сярэднім павялічацца на 5,3 %. Адпаведны ўказ 23 кастрычніка падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**
- Беларускім банкам хочуць дазволіць ідэнтыфікацыю кліентаў з дапамогай біяметрычных характарыстык твару і голасу.



- **«Камунарка» плануе пачаць пастаўкі прадукцыі ў амерыканскія гандлёвыя сеткі.**
- За неаплату паркоўкі ў Мінску прапануецца ўжываць павышаны тарыф.
- **Беларускі барэц вольнага стылю Іван Янкоўскі заваяваў сярэбраны медаль чэмпіянату свету ў Будапешце.**




# ПРАВОДКА ПАД ШПАЛЕРАМІ

### Як перазімаваць без праблем?

**У гэтыя дні ў Беларусі праходзіць пажарна-прафілактычная акцыя «За бяспеку разам». Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях разам з прадстаўнікамі іншых міністэрстваў і ведамстваў, сярод якіх праваахоўнікі, супрацоўнікі энерганагляду, цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва наведваюць сем'і, дзе выхоўваецца шмат дзяцей, а таксама тыя, дзе дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, а таксама старых, якія жывуць адны. Карэспандэнты «Звязды» адправіліся на Чэрвеньшчыну, каб пабачыць усё на свае вочы.** СТАР. 4




Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

## Анталогія ашуканства

Мы працягваем знаёміць чытачоў з прыкладамі махлярства і дзелімся парадамі, як пазбегнуць падману. Сёння нашымі суразмоўнікамі сталі работнікі пракуратуры Магілёва — памочнік пракурора Таццяна Іванова і старшы памочнік пракурора Марыя Івуціна. Мэта праекта ўсё тая ж — падказаць, як пазбегнуць непрыемных момантаў у жыцці і засцерагчыся ад злачынцаў.

# БІЗНЕС НА ДАВЕРЛІВАСЦІ

**Усе гэтыя гісторыі аб'ядноўвае менавіта празмерная даверлівасць грамадзян і чалавечая прагнасць. А яшчэ банальная прававая непісьменнасць. Тое, што дазваляе некаторым нядобрасумленным грамадзянам маніпуляваць людзьмі і «разводзіць» іх на грошы.**

### АМАЛЬ ПАВОДЛЕ БУЛГАКАВА

Ну як тут не ўспомніць класіка, які так вобразна апісаў містычнае прадстаўленне Воланда ў вар'етэ. Памятаеце момант, калі ў залу на людзей пасыпаліся чырвонцы? А потым грошы ператварыліся ў звычайныя паперкі. Дык вось, знайшоўся магілявчанін, які пажадаў паўтарыць гэты трук, але на свой манер. Усё пачалося з таго, што ён набыў у краме сувенірныя долары. На выгляд яны нагадваюць сапраўдныя — двухбаковы друк, на некаторых ёсць нават банкаўская стужка. На папераджальныя надпісы — «банкнот не з'яўляецца плацежным сродкам» і «Вясельны банк» звяртаеш увагу не адразу. У Магілёве, напрыклад, пачак з 80 такіх купюр прадаецца ўсяго за 3 рублі. 48-гадовы магілявчанін змог зарабіць на іх амаль 1500 беларускіх рублёў.

Ахвяр шукаў каля буйных гандлёвых цэнтраў або наўпрост на вуліцы. Аднойчы падышоў да пенсіянера і папрасіў дапамагчы зняць пакойчык у кватэры. Мужчына запрасіў госця да сябе, каб паглядзець умовы. Таму ўсё спадабалася, ён дастаў з кішэні 50 долараў задатку і са словамі — прабачце, беларускіх грошай няма, папрасіў даць яму хоць колькі беларускіх рублёў на дробныя расходы. Пенсіянер трапіўся шчодры і перадаў чалавеку, якога бачыў першы раз у жыцці, 140 рублёў. Толькі калі кватарант не вярнуўся, разгледзеў, што за «валюту» той яму пакінуў, і забіў трывогу. СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# ПАРТНЁРСТВА ЯК СІНОНІМ ДАМОЎЛЕНАСЦІ

**Супрацоўніцтва і абмен вопытам — Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з сакратаром Савета бяспекі пры Прэзідэнце Узбекістана**

**Візіт Віктара Махмудава ў Беларусь прысвечаны абмеркаванню ваенна-тэхнічнага ўзаемадзеяння. Яно з'яўляецца адным з раздзелаў карты далейшага развіцця супрацоўніцтва дзвюх краін. Выпрацаваць такі план Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў дамовіліся падчас афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ва Узбекістан у верасні гэтага года.**

Аляксандр Лукашэнка паабяцаў падзяліцца напрацоўкамі і вопытам беларускага ваеннага комплексу ў кірунках, якія зацікавяць партнёраў з Узбекістана, — ад падрыхтоўкі кадраў да ўзбраення.

Пазітыўную дынаміку ў супрацоўніцтве ў гэтай сферы падкрэсліў і Віктар Махмудаў. «Практычна ўся дарожная карта (план практычных дзеянняў па далейшым развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Узбекістанам у галіне бяспекі на 2017—2018 гады. — **Рэд.**), якую мы запланавалі на 2018 год, цалкам рэалізавана. Мы задаволены дасягнутымі вынікамі. І па выніках нашых кансультацый падпісалі новую дарожную карту на 2019—2020 гады», — сказаў **сакратар Савета бяспекі пры Прэзідэнце Узбекістана.**

«Мы абавязкова выканаем узятыя на сябе абавязацельствы», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар акцэнтаваў увагу, што ў адносінах з Узбекістанам за пару гадоў перaадолелі шлях, які не змаглі прайсці да гэтага за два дзесяцігоддзі.

Падчас размовы кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на значныя поспехі ў знешняй палітыцы свайго калегі з Узбекістана. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Шаўкат Мірзіёеў «хутка нармалізаваў адносіны з суседзямі, выдатна паводзіць сябе на міжнароднай арэне, у яго выдатныя адносіны і з Захадам, і з Усходам».

Па выніках двухдзённага візіту Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан у верасні 2018 года былі падпісаны 16 дакументаў аб развіцці ўзаемадзеяння ў разнастайных сферах. Найбольш прадукцыйнымі галінамі для супрацоўніцтва вызначаны вытворчая кааперацыя ў машынабудаванні, аграпрамысловым комплексе, транспартнай і фармацэўтычнай галінах, сферы інфармацыйных тэхналогій.

**Паводле БелТА.**

## Ва ўрадзе

# СЯРЭДНІ ЗАРОБАК — ВЫНІКІ ЗА ВЕРАСЕНЬ

**Учора прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС правёў рабочую нараду па заработнай плаце ў краіне, паведамляецца на сайце Савета Міністраў. Даныя за верасень аказаліся значна ніжэйшыя за ацэнку ўрада.**

«Падзенне выручкі з прычыны хістанняў курсу расійскага рубля не дазволіла многім прадпрыемствам падтрымаць узровень аплаты працы, які склаўся. Сярэдні заробак у рэальным сектары эканомікі склаў 1032 рублі, хоць і знізіўся да ўзроўню жніўня», — падкрэсліў Сяргей Румас. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што ўзровень аплаты працы ў бюджэтным сектары павялічыўся на 3,5 % і дасягнуў 746 рублёў. Паводле яго слоў, гэта крыху ніжэй за прагноз урада. І, як вынік, такі рост не змог цалкам кампенсаваць зніжэнне зарплаты ў рэальным сектары эканомікі. «Значныя адхіленні па асобных абласцях і міністэрствах паказваюць, што не для ўсіх органаў дзяржаўнага кіравання мэтавая задача па сярэдняй зарплаце з'яўляецца прыярытэтнай», — падвёў вынікі прэм'ер-міністр.

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў прааналізуюць прычыны, каб вярнуць дынаміку росту заработнай платы.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## На слыху

# ЦЭНТР ДЛЯ РАЗМЯШЧЭННЯ МІГРАНТАЎ

## пабудуюць у Полацкім пагранічным атрадзе

**У Мінску адбылася цырымонія адкрыцця праекта «Садзейнічанне Рэспубліцы Беларусь у вырашэнні пытанняў, звязаных з павелічэннем колькасці нерэгулярных мігрантаў».**

Праект фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца прадстаўніцтвам Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (МАМ) у Рэспубліцы Беларусь сумесна з Міністэрствам унутраных спраў і Дзяржаўным пагранічным камітэтам Беларусі. Партнёрамі праекта таксама з'яўляюцца ўпраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа і Беларускі рух медыцынскіх работнікаў.

Асноўная мэта праекта — падтрымаць Беларусь у распрацоўцы і рэалізацыі палітыкі і стратэгій у дачыненні да нерэгулярнай міграцыі і дачы прытулку з тым, каб наблізіць іх да еўрапейскіх і міжнародных стандартаў. Дасягненне зададзенай мэты плануецца ажыццявіць з дапамогай рэалізацыі трох кампанентаў праекта. Першы — гэта распрацоўка палітыкі і ўмацавання канстытуцыйнага і аператыўнага патэнцыялу дзяржаўных органаў і няўрадавых арганізацый, якія працуюць у сферы міграцыі. Другі — добраахвотнае вяртанне на радзіму і рэінтэграцыя нерэгулярных мігрантаў. Трэці — стварэнне сучаснай інфраструктуры па размяшчэнні нерэгулярных мігрантаў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

Важнасць праекта адзначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў Мікалай МЕЛЬЧАНКА.**

— Зараз ЕС і наша краіна знаходзяцца на заключным этапе па дагаворы па рэадмісіі. Выкананне гэтага пагаднення абавяжа нашу краіну прымаць пэўную колькасць нерэгулярных мігрантаў, якія перадаюцца краінамі — членамі ЕС. Рэалізацыя праекта дасць магчымасць Рэспубліцы Беларусь належным чынам выконваць міжнародныя абавязацельствы, прынятыя ў адпаведнасці з пагадненнем па рэадмісіі.

Бюджэт праекта складае 7 мільёнаў еўра. Тэрмін рэалізацыі — 2018—2022 гады. Згаданы праект з'яўляецца не першай ініцыятывай ЕС у галіне кіравання межамі. **Андрэа ВІКТАРЫН, кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі**, паведаміла:

— За апошнія 20 гадоў ЕС выдзеліў больш за 30 мільёнаў еўра на супрацоўніцтва з Беларуссю ў галіне кіравання межамі і рэалізацыі сумесных праектаў з мытнымі і пагранічнымі ведамствамі для таго, каб спрыяць легальнаму перамяшчэнню людзей і тавараў праз агульную мяжу.

**Зейнал ГАДЖЫЕЎ, кіраўнік прадстаўніцтва МАМ у Рэспубліцы Беларусь**, адзначыў:

— Паспяховая рэалізацыя праекта будзе патрабаваць максімальнай уцягнутасці і самааддачы бакоў, якія ўдзельнічаюць у ім. Ад усіх нас спатрэбіцца пэўная гнуткасць і гатоўнасць да змен, паколькі праект шмат у чым накіраваны на паляпшэнне заканадаўства ў галіне кіравання нерэгулярнай міграцыяй. Але, вядома, краевугольным каменем у любых прапанаваных зменах будзе з'яўляцца гуманнае стаўленне і павага да правоў мігрантаў.

Для забеспячэння годнага ўтрымання мігрантаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прадугледжана будаўніцтва альбо мадэрнізацыя некалькіх цэнтраў па размяшчэнні названых асоб. Вось што сказаў з гэтай нагоды **Ігар ПЕЧАНЬ, намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь:**

— Гэтым праектам прадугледжваецца істотна павысіць наш патэнцыял шляхам рэканструкцыі ўжо існуючых месцаў утрымання нерэгулярных мігрантаў. А таксама плануецца будаўніцтва цэнтра для размяшчэння мігрантаў змешанага тыпу ў Полацкім пагранічным атрадзе. Гэта неабходна, паколькі наступныя лічбы кажуць самі за сябе. За мінулы перыяд 2018 года органамі пагранічнай службы Беларусі на дзяржаўнай мяжы і тэрыторыі, якая прылягае да мяжы, затрымана 668 нерэгулярных мігрантаў з 62 краін. Мы канстатуем павелічэнне іх колькасці на 30 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Усё часцей сустракаюцца сярод нерэгулярных мігрантаў жанчыны і непаўналетнія дзеці. Для іх, а таксама для ўсіх без выключэння нерэгулярных мігрантаў неабходна ствараць умовы, якія забяспечаць іх правы, а таксама першую медыцынскую і псіхалагічную дапамогу.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## «Брэксіту» перашкаджае Паўночная Ірландыя



Тэрэза Мэй заявіла, што гатова «вывучыць усе магчымыя варыянты», каб выйсці з тупіка ў перамовах па «брэксіце». Брытанскі прэм'ер заявіла, выступаючы перад палатай абшчын, аб узгадненні 95 працэнтаў умоў выхаду з Еўрасаюза, у той жа час адзначыла «значныя цяжкасці» па пытанні мяжы Паўночнай Ірландыі. Улады Еўрасаюза прапанавалі захаваць гэты рэгіён Вялікабрытаніі ў складзе агульнага рынку ЕС і мытнай зоны. Аднак Лондан не даў на гэта згоды. «Як гарантаваць, што да канца пераходнага перыяду мяжы паміж Паўночнай Ірландыяй і Ірландыяй не будзе», — заўважыла Мэй перад палатай абшчын. Яна таксама заявіла, што для яе вельмі непажадана падаўжэнне пераходнага перыяду для Вялікабрытаніі і што ён павінен скончыцца задоўга да мая 2022 года. З брытанскім міністрам не згодная апазіцыя. Лідар лейбарыстаў Джэрэмі Корбін заявіў, што торы «паказалі сваю канчатковую некампетэнтнасць і пакутуюць ад рознагалоссяў у сваіх шэрагах». Фармальна «брэксіт» адбудзецца 29 сакавіка 2019 года, пасля чаго, згодна з планам, павінен наступіць пераходны перыяд да 31 снежня 2020-га, на працягу якога Вялікабрытанія абавязалася плаціць узносы ў бюджэт ЕС.

## У Кітаі адкрыты самы доўгі ў свеце 55-кіламетровы марскі мост

Старшыня КНР Сі Цзіньпін прыняў удзел у адкрыцці 55-кіламетровага тунэльнага маставога пераходу ў дэльце ракі Чжуцзян (Жамчужная), які звязаў адразу тры прыморскія гарады — Ганконг, Макаа і Чжухай. Урачыстая цырымонія адбылася ў прысутнасці 700 гасцей у горадзе Чжухай (правінцыя Гуандун), паведамляе радыёвяшчальная карпарацыя RTHK. Рух аўтамабіляў, аўтобусаў і грузавікоў па новым транспартным калідоры запушчана з сённяшняга дня. Ён будзе абмежаваны: для праезду неабходна мець спецыяльны дазвол і прайсці кантроль у мытна-іміграцыйных пунктах. Важнай асаблівасцю збудавання стаў падводны аўтамабільны тунэль працягласцю 6,7 кіламетра на ажыўленым участку суднаходства. Для яго ўзвядзення спатрэбілася стварыць два штучныя астравы. Канструкцыя моста разлічана на 120 гадоў і здольная вытрымліваць удары магутных тайфунаў і землятрусаў. Так, у сярэдзіне верасня аб'ект ужо прайшоў першы тэст на трываласць, выстаяўшы перад напорам наймацнейшага за апошнія паўстагоддзя ў рэгіёне супертайфуна «Мангхут». Характэрна, што самыя працяглыя аналагічныя масты таксама знаходзяцца ў Кітаі. Так, у 2011 годзе быў адкрыты 42-кіламетровы надводны аўтамабільны мост на ўсходзе КНР, які звязаў праз заліў партовы горад Цындаа з востравам Хуандаа ў бухце Цзяачжоў. Яшчэ два масты — абодва працягласцю больш за 32 км — звязваюць Шанхай з горадам Нінбо і глыбакаводным портам Яншань і часткова праходзяць над марской акваторыяй.



## У Японіі пачалі плаціць супрацоўнікам за здаровы сон



Японская кампанія CRAZY вырашыла даплачваць супрацоўнікам за правільны рэжым сну, расказала прадстаўнік прэс-службы арганізацыі Мію Гарай. «Кампанія плаціць супрацоўніку, калі ён будзе штодня спаць больш за шэсць гадзін пяць дзён на тыдзень. Адзін бал роўны адной іене. За пяць дзён працяглага сну супрацоўнік атрымае 500 балаў, за шэсць дзён — 600 балаў, або іен. Тым супрацоўнікам, якія на працягу месяца працягвалі прытрымлівацца здаровай сістэмы сну, выплачваецца дадатковы бонус у памеры тысячы іен. Гэта значыць, такім чынам за месяц можна дадаткова зарабіць пяць тысяч іен (каля 50 долараў)», — сказала Гарай. Кампанія CRAZY створана ў 2012 годзе і спецыялізуецца на арганізацыі вяселляў. З самага пачатку ахова здароўя супрацоўнікаў стала такім жа асноватворным прынцыпам кампаніі, як імкненне да росту прадукцыйнасці, адзначыла прадстаўнік прэс-службы. Зараз за атрыманыя ад правільнага сну балы можна зрабіць пакупкі ў карпарацыйным кафэ і сталовай. Сістэма працуе за кошт праграмы на сотавым тэлефоне. Яна фіксуе найменшыя рухі, такім чынам, калі чалавек ляжыць у ложку, але не спіць, гэты час не будзе залічаны як сон. Усе даныя адпраўляюцца ў кіруючы цэнтр кампаніі, дзе яны перакладаюцца ў балы. Дарэчы, як падлічылі навукоўцы з універсітэта Кітасата, штогод эканоміка Японіі губляе на праблемах, звязаных з недасыпаннем работнікаў, каля 3,5 трыльёна іен (прыкладна 31 мільярд долараў).

■ Ёсць нагода

# Камсамол — вачыма сведак і сучаснікаў

**Больш як 300 фотаздымкаў, у тым ліку адноўленыя літаральна па абрыўках партрэты камсамольскіх лідараў мінулых гадоў, успаміны колішніх актывістаў і сабраныя калектывам аўтараў па крупінках звесткі і факты з 13 архіваў Беларусі і Расіі.... У Мінску прэзентавалі выданне «У рытме імклівых гадоў... Нарысы гісторыі камсамола Беларусі», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда» і ахоплівае агулам 116 гадоў гісторыі маладзёжнага руху.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Сярод яе аўтараў — вядомыя айчынныя навукоўцы і даследчыкі, многія з якіх самі маюць вопыт работы ў камсамольскай арганізацыі ці яе пераемніку — Беларускім рэспубліканскім саюзе моладзі. На 280 старонках у дзевяці артыкулах навукова-папулярнага выдання грунтоўна і падрабязна расказваецца гісторыя ўзнікнення і развіцця як беларускага камсамола, так і маладзёжных арганізацый суверэннай Беларусі. «Гэта партрэт камсамола без рэтушы, максімальна аб'ектыўны, бо тут прадстаўлены не толькі подзвігі і здзяйсненні камсамольцаў, але і трагічныя падзеі, якія адбываліся цягам стагоддзя», — расказаў **дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, вядомы гісторык і палітолаг Вадзім ГІГІН,** які выступіў рэдактарам-укладальнікам кнігі.

**Старшыня Савета ветэранаў камсамола, піянерскага і маладзёжнага руху Аляксей КРЫЎДЭНКА** — у 1990—1991 гадах — першы сакратар ЦК ЛКСМБ — нагадаў, што камсамол стаў натхняльнікам многім важных з'яў, каштоўных і запатрабаваных і ў наш час: так, у свой час дзякуючы моладзі нарадзіліся першыя суботнікі, студатрады, нормы ГПА, сацыялістычныя спаборніцтвы... «На мой погляд, гэта кніга не столькі пра мінулае, колькі пра будучыню, — лічыць Аляксей Крыўдэнка. — І з яе ёсць, што ўзяць для работы настаўнікам, выхавальнікам, педагогам у вайсковых часцях, у вышэйшых навучальных установах — усім тым, хто выхоўвае нашу цяперашнюю моладзь, у тым ліку ў патрыятычным кірунку». А **першы сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК** падкрэсліў, што ўнікальны зборнік нарысаў, у якім адлюстраваны самыя яркія і значныя моманты гісторыі камсамольскага руху, стане яшчэ адным падарункам да 100-гадовага юбілею ўсесаюзнай маладзёжнай арганізацыі. Дарэчы, яшчэ адзін падарунак — намаляваны мастаком на вокладцы значок з лічбай 100 атрымае рэчыўнае ўвасабленне і будзе ўручаны актывістам і арганізацыям-пераемнікам напрыканцы юбілейнага камсамольскага тыдня, 29 кастрычніка, на ўрачыстым сходзе «Камсамолу 100: эстафета пакаленняў» у Палацы Рэспублікі.

Першы тыраж выдання «У рытме імклівых гадоў... Нарысы гісторыі камсамола Беларусі» складае 2500 асобнікаў, частка з якіх паступіць у продаж, а таксама трапіць у школы і бібліятэкі. Дарэчы, ужо сёння абмяркоўваецца дадатковы тыраж, паколькі кнігу замаўляюць многія арганізацыі. І гэта, падкрэслівае Вадзім Гігін, толькі частка вялікай працы — наперадзе даследчыкаў чакае падрыхтоўка вялікай навукова-тэарэтычнай манаграфіі, якая з дапамогай Міністэрства адукацыі ўбачыць свет у 2020 годзе, калі будзе адзначацца 100-годдзе непасрэдна беларускага камсамола. Таксама абмяркоўваецца магчымасць выдання кніг, якія расказалі б сучаснай моладзі пра камсамольскія песні, знакамітыя і малавядомыя камсамольскія будоўлі і г. д.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Даслоўна

# «ЦЯРПЕЦЬ ТАКОЕ БЯЗЛАДДЗЕ НЕ ХОЧАЦЦА»

## Генадзь САВІЛАЎ расказаў пра першыя сто дзён сваёй работы на чале Беларускай федэрацыі хакея

**«Я хацеў бы папрасіць прабачэння ва ўсіх беларускіх балельшчыкаў за выступленне мінскага «Дынама» і зборнай краіны на апошнім чэмпіянаце свету, — сказаў Генадзь Генадзевіч напачатку. — Ад імя кіраўніцтва федэрацыі, адміністрацыі, трэнераў. Хтосьці можа далучыцца да мяне, хтосьці — не. Напэўна, мы ўсе вінаватыя ў тым, што так расчароўваем нашага балельшчыка. Паверце, мы спрабуем выправіць сітуацыю. Сапраўды, нікога не цікавіць, хто вінаваты ў гэтых агрэхах, усе хочуць бачыць змяненні і спыненне гэтага некантралюемага падзення», — запэўніў кіраўнік федэрацыі.**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### Пра «Дынама»

Большая частка размовы датычылася беларускага прадстаўніка ў Кантынентальнай хакейнай лізе, жахлівай гульні «Дынама» і наспелай змены ў кіраўніцтве клуба. Раней ужо гаварылася пра тое, што федэрацыі і «Дынама» неабходна новая форма супрацоўніцтва. «Цяпер распрацоўваецца план зліцця федэрацыі хакея і мінскага «Дынама», гэта рабочы план, які будзе накіраваны на тое, каб у хакеі ў нас было адзінства кіраўніцтва, каб грамадскасць, кіраўнікі, балельшчыкі ведалі, з каго спытаць за вынікі, — расказвае Генадзь Савілаў. — Спадзяёмся, што закончанне працэсу зліцця будзе дзесьці ў канцы лютага наступнага года». Верагодна, тады і будуць агучаны яго падрабязнасці.

Нагадаем, у панядзелак стала вядома аб змене кіраўніцтва ў хакейным «Дынама», пасаду генеральнага дырэктара клуба пакінуў Анатоль Курылец. Як адзначыў Генадзь Савілаў, трэба спадзявацца, гэты крок не стаў запозненым. «Кола кандыдатаў на гэты пост не вельмі шырокае, але больш правільна будзе, калі грамадскасць даведаецца пра імя новага гендырэктара з вуснаў кіраўніка назіральнага савета «Дынама», а не ад мяне». Таксама старшыня федэрацыі паведаміў аб тым, што і ў трэнерскім штабе «зуброў» чакаюцца карэкціроўкі. «Яны ўжо прагаворваюцца, вядома, цярпець далей такое, мякка кажучы, бязладдзе не хочацца», — падкрэсліў Генадзь Савілаў.

### Пра зборную

Кіраўнік адзначыў, што ён прыхільнік стратэгічных задач. «Не варта рабіць трагедыю з таго, што наша зборная вылецела з эліты, гэта адбывалася і раней, паступова мы туды вярталіся. Трагедыя — гэта калі ў такой краіне, як Беларусь, з хакейнай гісторыяй, можа, не такой яркай, як у Канадзе, але ўсё роўна з гісторыяй, на працягу многіх гадоў няма ніводнага высакакласнага хакеіста. Не бачу сэнсу ў тым, каб канцэнтравацца на імгненным выніку на чэмпіянаце свету ў Казахстане; што гэта нам дасць, калі наступныя чатыры чэмпіянаты мы правалім? Хоць, вядома, калі не трапім у эліту пасля чэмпіянату ў 2019 годзе, гэта будзе ўспрынята негатыўна балельшчыкамі, скароціць ці знішчыць крэдыт даверу да хакейнага кіраўніцтва, у тым ліку і да мяне. Поспех ці няўдача каманды ў Казахстане не вырашыць галоўнай задачы — падрыхтоўкі якаснага рэзерву ў аб'ёмах, якія патрабуюцца нацыянальнай камандзе».

### Праблемы тыя ж

Кіраўнік федэрацыі адзначыў, што за тры месяцы яго работы праблемы не пашырыліся і не паглыбіліся. «Шмат у каго ёсць шчырая вера ў тое, што трэба ад 7-8-гадовых дзяцей дамагацца тых жа матывацыйных установак, якія дапамагаюць дарослым людзям дамагчыся поспеху. Ад гэтага мы пажынаем плады з году ў год, у 11—12 гадоў на турнірах ва ўсім свеце беларусы з буйным лікам перамагаюць шведаў, канадцаў, амерыканцаў, фінаў, а праз пяць гадоў, да выхаду з хакейных школ, мы ім ужо саступаем. Наша асноўная задача цяпер заклікаць спецыялістаў да актуальнасветнага вопыту ў трэнерстве, да іншага падыходу ў рабоце з дзецьмі». Генадзь Савілаў адзначыў, што ўжо многія адгукнуліся на гэты заклік і пачалі рухацца ў патрэбным напрамку. «На наш погляд трэба прыбраць залішнюю спецыялізацыю ў дзіцячым хакеі і сканцэнтраваць дзіцячых трэнераў і бацькоў на тым, што хакей гэта не проста канькі, лёд і клюшка. Гэта яшчэ і тэнісны мячык, бадмінтонная ракетка, дроцікі, кулькі і гэтак далей».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**


**Извещение о проведении повторного аукциона по продаже земельных участков в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.(0212) 24-63-14.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| **Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 221281201601000093, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Дрюково, ул. Центральная, участок № 4, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000В, придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена**: 2 000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. |
| **Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым № 221281201601000094, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Дрюково, ул. Центральная, участок № 5, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена**: 2 000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140200420000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Вороновский сельсовет) |
| **Лот № 3.** Земельный участок с кадастровым № 221288109601000642, площадью 0,0951 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д.Сокольники, ул.Северная, 1А, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 8 000,00 бел.руб. **Размер задатка:** 800,00 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY54AKBB36003141101250000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Октябрьский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 09.11.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 24.10.2018 с 8.30 по 08.11.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь) |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос.регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией права, ограничений (обременений) прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок не превышающий двух лет либо в сроки, определенные проектно-сметной документацией; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем.участка. Конт.тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by



Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ № 2496761 **считать недействительным.**
УНП 100122726



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Извещение о проведении повторного аукциона** | | | |
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | Гродненское областное потребительское общество, Гродненская обл., г. Гродно, ул. 1 Мая, 28 (Сморгонский филиал, Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Чапаева, 3) | | |
| **Предмет аукциона Местоположение – Гродненская обл., Сморгонский р-н** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (населенный пункт) |
| Лот № 1 | | | |
| **Здание магазина** | 77,9 кв. м | 443/С-21062 | Кореневский с/с, д. Лубянка, 1Б |
| Составные части и принадлежности: блочный сарай | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0473** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина и склада) с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 5 350,00 бел. руб.** (снижена на 50 %) | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание магазина** | 93,9 | 443/С-21492 | Синьковский с/с, д. Коты, 2Б |
| Составные части и принадлежности: блочно-кирпичный, панельный склад магазина, кирпичный склад магазина | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0898** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий магазина и складов с установленными ограничениями (охранная зона линий электропередачи, пл. 0,0096 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 5 200,00 бел. руб.** (снижена на 50 %) | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от **28.08.2018**. | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Аукцион состоится 06.11.2018** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 05.11.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by** | | | |

# БІЗНЕС НА ДАВЕРЛІВАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Чарговы фокус з сувенірнымі доларамі махляр правярнуў ужо з немаладой жанчынай. Прыдумаў гісторыю, нібыта ён толькі што прыехаў у горад і яму тэрмінова патрэбны грошы. «Вось вам 50 долараў, дайце хоць што-небудзь у беларускіх рублях», — маліў ён. І жанчына, не чакаючы падвоху, адлічыла 70 рублёў. Калі нарэшце зразумела, што купюра не сапраўдная, незнаёмца ўжо побач не было.

З яшчэ адным даверлівым грамадзянінам махляр разлічыўся ліпавымі доларамі за праезд. Кіроўца прыняў «валюту» і нават даў 50 рублёў рэшты. А «долары» панёс у банк, дзе яму і адкрылі вочы.

Тацццяна Іванова ўдакладняе:

— Усе, каго падмануў мужчына, пенсіянеры, двум з іх было нават болей за 70 гадоў. Мужчына прызнаны вінаватым па дзвюх частках артыкула 209 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з законам ён павінен выплаціць 60 базавых велічынь, кампенсаваць маральную страту пацярпелым і выдаткі за матэрыялы на правядзенне экспертызы па купюры.

Дарэчы, у Магілёве гэта не адзіны махляр, які зарабляў на сувенірных доларах. Марыя Івуціна прыгадала, што тры гады таму за фальшывыя банкноты неадназова судзімы мужчына купіў сабе ноўтбук. Але прадавец хутка разгледзеў, што гэта за грошы, і кінуўся наўздагон. Затрымаць злачынцу дапамаглі міліцыянеры.

### Да ведама

**Ніколі не забывайцеся пра народную мудрасць: бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Трэба ўважліва глядзець, што вам прапаноўваюць, і не спяшацца заключаць здзелку з незнаёмымі людзьмі. Тым больш што ў Беларусі разлікі валютай паміж грамадзянамі наогул забаронены. Нават калі купюра сапраўдная, можна пазбавіцца не толькі заробленых на абмене грошай, але яшчэ і атрымаць штраф у памеры 50 базавых велічынь за незаконную здзелку.**

## ЯК ВЯРНУЦЬ ГАДЖЭТ З РАМОНТУ

Бываюць выпадкі, калі добраахвотна гэтага рабіць не жадаюць. У Магілёве ахвярамі аднаго такога «майстра» за два гады сталі 10 чалавек. Працаваў 20-гадовы прадпрымальнік легальна, нават арандаваў пад майстэрню памяшканні ў розных гандлёвых цэнтрах. Браўся за рамонт любых гаджэтаў. Прычым выключна па перадаплаце. Распіскі і квітанцый сваім кліентам не даваў, усе зносіны будаваліся на даверы. Адна з пацярпелых здала ў рамонт тэлефон, перадала запатрабаваную майстрам суму «на запчасткі», але яе чаканні вельмі зацягнуліся. Стала цікавіцца, калі ж адрамантуюць? Малады чалавек — сама ветлівасць — супакойваў, маўляў, усё добра, запчасткі ўжо прывезлі з Мінска, але тут яшчэ адна дэталь паляцела і патрэбны грошы, каб яе заказаць. Жанчына яшчэ ўнесла задатак, але тэлефона так і не дачакалася. Майстар перастаў адказваць на яе званкі і з'яўляцца на рабочым месцы. Па аналагічнай схеме малады чалавек «развёў» яшчэ чатырох кліентаў. У кожнага бралася перадаплата, даваліся абяцанкі-цацанкі, а потым сувязь з майстрам абрывалася.

У «бермудскім трохвугольніку» зніклі не толькі тэлефоны, але і зарадныя прыстасаванні, планшэты. Быў выпадак, калі пацярпелы прапанаваў: вярні планшэт і грошы, я аднясу тэхніку ў іншую майстэрню. Малады чалавек сумленна прызнаўся, што планшэта няма, але ён гатовы аддаць наўзамен тэлефон. Пацярпелы не стаў больш выпрабоўваць лёс і звярнуўся ў міліцыю.

Падчас следства высветлілася, што тэлефонных спраў майстар паспеў правярнуць аферу яшчэ і з былой ва ўжыванні машынай. Пры пакупцы «Форда» ён даў гаспадару 600 рублёў авансу, абяцаў астатнія грошы прынесці потым, сеў у машыну і з'ехаў у невядомым напрамку. Як вы ўжо здагадаліся, былы ўладальнік аўто дазваніцца да свайго пакупніка больш не змог.

— Здзіўляе даверлівасць людзей, іх цярплівасць. Некаторыя чакалі свае рэчы па паўгода і звярталіся ў міліцыю, толькі зусім страціўшы надзею. Дарэчы, нягледзячы на дастаткова юны ўзрост, малады чалавек ужо паспеў атрымаць судзімасць за махлярства. Тады яго пакаралі двума месяцамі арышту. Але ён ніякіх высноў не зрабіў. Агульны доўг, які хлопец павінен вярнуць пацярпелым, склаў каля 3,5 тысячы рублёў. А тры наступныя гады яму прыйдзецца правесці ў папраўчай установе адкрытага тыпу, — канстатуе Тацццяна Іванова.

### На заметку

**Не будзьце вельмі даверлівыя. Калі нехта ставіць умовы і пры гэтым пазбягае браць на сябе адказнасць, ён відавочна нешта задумаў. Патрабуйце квітанцыю, дзе будзе апісана ўсё, што вы здалі ў рамонт, і ў якой ступені зносу яно знаходзілася. Там жа павінна быць пазначана сума перадаплаты. І наогул, перад тым як скарыстацца чыімі-небудзь паслугамі, пацікаўцеся, што за фірму ён прадстаўляе, дзе яна зарэгістраваная, якія водгукі ёсць у інтэрнэце.**

## ЯК ЖАНОЧАЕ ФУТРА СТАЛА ДЗІЦЯЧАЙ КУРТКАЙ

А гэта трэба браць на заметку наведвальнікам інтэрнэт-рэсурсаў па продажы былых ва ўжыванні рэчаў. Менавіта там магілёўчанка размясціла аб'яву, што прадае футра-трансформер з сапраўднага пясца. Трэба сказаць адразу, што ніякага футра ў яе не было, а фота яна ўзяла ў інтэрнэце. Але пакупніца з Ліды, якой спадабалася рэч, гэтага яшчэ не ведала. Яе толькі крыху здзівіла ўмова спачатку ўнесці перадаплату. Яна нават паспрабавала паспрачацца, маўляў, вы ж нічым не рызыкуеце, на пошце, пакуль грошы не аддам, тавар не атрымаю. Але магілёўчанка стаяла на сваім — або перадаплата, або ніякага футра. У рэшце рэшт пакупніца пагадзілася, адправіла 150 рублёў, але чэк на ўсялякі выпадак сфатаграфавала. Калі прыйшло паведамленне на пасылку, яна ўзяла з сабой сяброўку, якая потым зафіксавала момант адкрыцця скрыні на камеру. І, як аказалася, недарэмна. Замест футра ў пасылцы аказалася дзіцячая куртка чырвонага колеру.

— Абвінавачаная не чакала, што пацярпелая напіша заяву ў міліцыю. Прызналася, што яе аднойчы так падманулі і яна нікуды не звярталася. Наадварот, ёй стала цікава, ці зможа яна кагосьці абвесці вакол пальца. У выніку атрымала судзімасць. Самае цікавае, што маладая жанчына ў грашах вялікай патрэбы не мела. Яе муж дастаткова забяспечаны чалавек. За злачынства ёй пагражаў штраф або грамадскія работы. І яна прасіла штраф, каб не ганьбаваць сябе перад людзьмі. Але ж суд вынес пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ. Магчыма, пакуль яна будзе падмятаць вуліцу ці фарбаваць агароджу, то ўсвядоміць, што зрабіла, і больш не будзе жартаваць з законам, — канстатуе Тацццяна Іванова.



**Долары сапраўдныя і фальшывыя: як той казаў, знайдзіце адрозненні.**

Пра тое, што трэба асцярожна рабіць пакупкі ў інтэрнэце, нагадвае і памочнік пракурора Марыя Івуціна:

— Быў выпадак, калі 21-гадовы магілёўчанін у адной з сацыяльных сетак «адкрыў» краму, размясціў там фота адзення і пачаў гандляваць. Пакупнікі перасылалі грошы на яго банкаўскую картку, а вось тавар так дачакацца і не змаглі. У адказ на іх прэтэнзіі малады чалавек выдаліў сваю старонку. Але міліцыі няцяжка было знайсці яго. Ахвярамі махляра сталі пяць чалавек. Малады чалавек атрымаў судзімасць, а таксама штраф у памеры 40 базавых велічынь, якія прыйшлося кампенсаваць яго бацькам.

### Давярай, але правярай

**Купляйце тавар толькі ў надзейных інтэрнэт-крамах. Пры яго атрыманні здымайце працэс распакоўкі на відэа. Так вы зможаце даказаць, што тавар першапачаткова быў няякасны або не адпавядаў запыту. Пры набыцці рэчаў, якія былі ў карыстанні, загадзя абгаварыце з прадаўцом выхад з сітуацыі на той выпадак, калі будуць знойдзены дэфекты. І заўсёды захоўвайце магчымасць вяртання тавару, калі ён вам не падышоў.**

Нэлі ЗІГУЛЯ.

# ПРАВОДКА ПАД ШПАЛЕРАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Насельніцтва Чэрвеньскага раёна складае каля 32 тысяч чалавек. Прыкладна трэць з іх — жыхары раённага цэнтра. Шмат сярод іх людзей старых. І 440 шматдзетных сем'яў.

Адна з такіх, сям'я Тоўсцікаў, жыве ў прыгожым дагледжаным доме. Дома мы застаём гаспадыню Валянціну Анатолеўну.

— У нас праходзіць акцыя «За бяспеку разам!», — кажа **інспектар нагляду і прафілактыкі Чэрвеньскага РАНС Кірыл БАЖКО.** — Абследуем, як дом падрыхтаваны да зімы. У вас якая сістэма ацяплення? І калі вы апошні раз правяралі вентыляцыйныя каналы?

— Грэемся мы газам. А вентыляцыйныя каналы правяралі месяц таму, як і кацёл. Вось усе дакументы. Праводка новая, пажарныя апавяшчальнікі стаяць ва ўсіх жылых пакоях і выведзены на вуліцу.

— Зараз праверым, як працуе, — кажа Кірыл Бажко і падносіць ручку да апавяшчальніка. Праз некалькі секунд той пачынае пішчаць.

— Апавяшчальнік паставілі летась, літаральна праз некалькі дзён пасля таго, як з'явіўся трэці малы, — кажа гаспадыня. — Муж замяніў батарэйку, калі прыбор пачаў пішчаць. Дома ён стараецца не курыць, каб мы не дыхалі дымам. Адзінае — застаўся толькі касметычны рамонт, але яго мы зробім налета.

Па наступным адрасе нас сустракае вельмі гасцінная і жвавая бабуля Зінаіда Ярашэвіч. Нават і не верыцца, што ёй ужо за 70 гадоў. Жыве яна адна. 50-гадовы сын памёр два гады таму. А больш дзяцей у старой не засталося. Затое бабулі дапамагае ўнук, які жыве і працуе ў Чэрвені. Дом зараз рамантуецца — на падлозе ляжыць скручаны лінолеум, шпалеры таксама паказваюць на тое, што іх неўзабаве заменяць.

— Печка ў вас у добрым стане, — кажа Кірыл Бажко. — А прыпечны ліст?

— Збоку. Тут печка крыху нестандартная, і таму топка каля сцяны.

— Бабуля, нельга ж было праводку фарбаваць! — зазначае **дзяржаўны інспектар Чэрвеньскай раённай інспекцыі энергагляду Дзмітрый КАМІНСКІ.** І сапраўды, праводка ў хаце мае незвычайны чорны колер.

— Чаму гэта? — вельмі здзіўляецца старая. — Я ж хацела, каб было прыгажэй.

— Таму што ізаляцыя становіцца гаручай. А ў вас яшчэ і пад шпалерамі правады пакладзены. А калі прабой здарыцца? Вы ж не заўважыце, што нешта не так. І будзе пажар.

— А я карабы пастаўлю. Вось калі будзем клеіць новыя шпалеры, тады і памяняю. З унукам усё зробім.

— Вы патэлефануйце яму, каб ён яшчэ комін праверыў.

— А ўнук ужо злазіў на гарышча. Ён да мяне перыядычна прыходзіць і ва ўсім дапамагае.

— Нешта я тут у вас аўтаномны пажарны апавяшчальнік не бачу, — кажа Кірыл Бажко.

— Гэта вы яго не заўважылі, — пасміхаецца старая. — Вось жа ён, над дзвярыма. Мне сказалі, што калі батарэйка стане слабой, то апавяшчальнік пачне пішчаць. Але пакуль усё ціха.

— Трымайце памятку па электрабяспецы, — кажа Дзмітрый Камінскі. — А па праводцы ўсё ж не зацягвайце. Зіма наперадзе, не самы лепшы час для рамонту...

— Зробім! — упэўнена кажа бабуля. — Вось я ўжо лінолеум купіла, спачатку яго заменім. А пасля за праводку возьмемся...

Гаспадар наступнага дома — пенсіянер Мікалай Шыбко. Хоць даўно жыве ён адзін, але візуальна гэтак не здаецца. Унутры ўсё чыста прыбрана. Ложак засцелены, над ім прымацаваны радыёпрыёмнік. На экране тэлевізара — кадр нейкага серыяла. Здаецца, што гаспадыня кудысьці выйшла... Але насамрэч Мікалаю Барысавічу дапамагае сацыяльны работнік.

— Якое ў вас ацяпленне? — пытаецца Кірыл Бажко.



Фота Тацццяны ТКАЧОВАЙ.

— Газавае. Кацёл у прыбудове. Апавяшчальнікі тут. Спецыялісты газавай службы прыходзілі да мяне ў жніўні. Усе дакументы ёсць.

— А навошта вы заклеілі праводку шпалерамі? — пытаецца Дзмітрый Камінскі. — Трэба ж перарабіць.

— Гэта яшчэ было да мяне зроблена... Я шмат часу праляжаў у бальніцы, і таму не мог займацца рамонтам.

Нашу ўвагу прыцягвае комін. На ім візуальна бачна трэшчына.

— А вось яго неабходна адрамантаваць, — кажа Кірыл Бажко. — Так, ён у вас пабелены. Значыць, калі не ўвесь дым пойдзе на вуліцу, то вы заўважыце. Аднак усё роўна, у раёне бываюць пажары з-за няспраўных печаў.

— Даўняя гісторыя. Во, бачыце, як бэлька крыва ляжыць? Ды і дом крыху «гуляе», што заўважна па дзвярах, якія часам складана адчыняюцца. Таму я папрасіў, каб мне патынкавалі комін, але ж сажы пакуль няма, як бачыце...

— А электрабойлер ёсць у вас?

— Ёсць. Але я ім узімку карыстаюся, — запрашае Мікалай Шыбко ў прыбудову.

— Не зусім правільна ён у вас падключаны, — кажа Дзмітрый Камінскі.

— А што з ім не так? — цікавіцца стары.

— Каб разгрузіць электрычную сетку, мы рэкамендуем рабіць для яго асобнае падключэнне з дыф-аўтаматам. У рэжыме нагрэву бойлер усё-такі спажывае шмат электрычнасці. Я пакіну вам памятку, каб вы пагледзелі, як гэта правільна робіцца.

— У мяне пробкі стаяць аўтаматычныя. І я адначасова не ўключаю бойлер з чым-небудзь, бо разумею, што занадта вялікая нагрузка будзе.

— Пробкі могуць яе не заўжды адчуваць, — тлумачыць Дзмітрый Камінскі. — Можа здарыцца так, што корпус пачне праводзіць ток. Стоячы басанож на кафельнай падлозе, можа атрымаць удар токам. Дыф-аўтамат жа адразу выб'е...

А вось у Тамары Гус, якая выхоўвае двух дзяцей з парушэннямі развіцця, з праводкай, печкай і апавяшчальнікамі ўсё аказалася добра. Больш за тое — апавяшчальнікі ў іх доме стаяць нават у калідоры. Сістэма спраектавана так, што спрацоўванне апавяшчальнікаў пачуюць не толькі гаспадары, але і суседзі па вуліцы. Сацыяльная служба прывезла, сярод іншага, для сыноў гаспадыні невялікі сюрпрыз — мяккія цацкі. І ў вачах дзяцей загарэлася іскрынка...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Простая мова

# У ЛЕС... І З ЛЕСУ

**Пісьменніца Лідзія Арабей (светлай памяці!) лічыла, што чытанне — працэс інтымны, патрабуе пэўнага часу, месца, крэсла пад таршэрам, стала, цішыні... Майго чытання ў тралейбусах-трамваях яна не прызнавала, прычым катэгарычна.**
**А шкада, бо ў ім — свае цікавінкі. Ну вось надоечы — у натоўпе, у прыцемку — у «трох словах» заблудзіла: калега напісаў, што ў аднаго мужчыны (даслоўна) *«...нюх на грошы быў чым у нямецкай аўчаркі»*.**
**Нейкае слова прапушчана? Ці знак прыпынку?**
**«Вярнулася» назад, зноў і зноў перачытала фразу і толькі пасля гэтага ўбачыла, што ўсё ў ёй правільна — памылак няма. Проста ў пачатку сказа напісана: *«нюх не горшы...»***
**Як той казаў, што каму дапякае, той пра тое і гукае.**

## ХЛЕБА? НЕ ТРЭБА...

Будні, раніца, дзяжурная праверка: перш чым з дому сысці, трэба ж паглядзець, ці выключаны святло і газ, ці з сабой праязны, кашалёк, ключы...

Суседкі гэту «рэвізію» «чыняць» ужо за парогам — у ліфце.

— Ты бутэрброды ўзяла? — пытае матуля.

— Не, абыдуся, у буфеце перакушу, — адмахваецца дачка-пяцікласніца.

— А мабільнік?

— Ой... Ён таксама дома застаўся... Трэба вярнуцца.

...Без сувязі, выходзіць, як без рук. І горш, чым без хлеба.

## ДЗІЎНЫЯ ЛЮДЗІ

Горад, вуліца, натоўп: нехта ў ім справа ідзе (у бок прыпынку), нехта — злева, нейкая жанчына — уперадзе. Паходка ў яе цікавая (качкай перавальваецца з нагі на нагу). І адзежка — таксама: з яркай латкай пад каўняром, з вешалкай, з белай біркай збоку...

— Прабачце, — перапрашаем ужо спыніўшыся, — можа, мы не разумеем чаго, але куртачка на вас, здаецца, навыварат?

— У мяне?! Вы з глузду з'ехалі! — з паўабарота заводзіцца жанчына.

Аднак ляпае сябе па сцёгнах, шукаючы кішэні, і, не знайшоўшы іх, «фантаніруе» далей:

— Цьфу-ты ну-ты... А я ж на базар так з'ездзіла... І ў краму схадзіла... Хоць бы хто што сказаў... Во людзі, во людзі...

І сапраўды — не дагадзіць: нешта скажы ім — дрэнна. І не скажы — таксама.

## ХТО БАІЦЦА...

Калі б муж у Дзіны быў ды хоць трохі зарабляў (а калі б зарабляў, дык, можа, і быў бы), яна падгадавала б дачушку да трох ці хоць бы да двух з паловай гадкоў — пасядзела б яшчэ ў дэкрэтным. А так...

У садок павяла — сёлета, у жніўні. Гэта, ёй сказалі, найлепшы час, бо пазней, увосень, малыя пачнуць хварэць і тады ўсе мікробы будуць «ліпнуць» да новенькай...

Як і дрэнныя словы.

...І таго, і другога Дзіна чакала: але ж неяк пазней. А тут — толькі з месяц дзіця ў садок пахадзіла (спачатку з мамай, на гадзінку-другую...) і ўжо, бач, «набралася»: крычыць са свайго куточка: *«Ляля бяць...»*, *«Міся бяць...»*

Ад неспадзеўкі ў матулі аж рукі затрэсліся, мову адняло — ва ўсякім разе спачатку. Але ж потым вырашыла не завастраць на гэтым увагу малой. Глядзіш, на дурное яна і забудзецца.

Ага, як той казаў, зараз: паўтарае — прычым раз за разам, піхаючы ў рукзак... то адну, то другую цацку.

І толькі тут да матулі даходзіць, што на іх — на ляльку з мядзведзікам — дзіця не сварыцца, яно проста думае ўголас (ці ў мамы пытае?), што з сабою *браць* на прагулку, а што не браць.

## «...ВЁСЦЫ ЛЁГКА»

Праўду кажуць, што восенню і верабей багаты: цётка Іра насаліла агуркоў і грыбоў, наварыла варэнняў і аджыкі, наскладала ў скрынкі яблыкаў.

І насушыла іх — злажыла ў трохлітровыя слоікі, наставіла на шафу: шарэнгамі стаяць — жоўценькія, прыгожыя, можна сказаць, залатыя...

— Во-во, гэта слоўца — самае дакладнае, — смяецца гаспадыня, — бо я на іх столькі электрычнасці спаліла, столькі грошай і часу...

Прыпеўка з нагоды:

*Горад кажа: вёсцы лёгка,*
*У людзей — усё сваё...*
*Ды пакуль тая палёгка,*
*Укладзешся — ё-маё!*

## ДВОЕ

Горад, падземны пераход. На прыступках, што вядуць уніз, — мужчына-пабіраха (ля ног — кардонка з надпісам: «На еду. Спасибо»); на прыступках, што вядуць угору, — жанчына з ураджаем: яблыкі (чырвоныя, жоўтыя, зялёныя... Як і прыцягнула?!) загадзя разложаны ў асобныя пакецікі — толькі бяры! Бабуля часам «тасуе» іх — паварочвае прыгажэйшымі бакамі, часам — соладка дрэмле ці нават... спіць?

Будзіць яе, вядома ж, не хочацца, а вось яблыкаў купіць (нават маючы свае) — так...

Чыста з павагі.

## АДЗІН ДОМА

Вечар, тэлевізар, падборка навін. Сярод іх — крымінальных — як, здаецца, штодня хапае трагічных. Абрывак фразы: «У хаце на час пажару знаходзіўся пяцідзесяцігадовы сын гаспадыні. Сама яна была ў суседкі».

Пакінула, выходзіць, «дзіцятка»... А нельга было...

Нават такое?

## ШТО ПАСЕЕШ?

...Маладыя жанкі, сабраўшыся разам, шкадавалі старых, што жывуць з п'янюгамі: з «дзеткамі», якія адбіраюць грошы, выносяць з дому апошнія рэчы, часам — б'юць і, што называецца, плакаць не даюць. Бо паплач (а тым больш у міліцыі) — горай стане...

Значыць, нешта не дагледзелі бацькі, нешта ўпусцілі.

— Але ж самі выхоўвалі — самі і вінаваты, — казалі маладыя жанкі пра старых, у думках, відаць, не маючы, што няма застрахаваных, што на месцы апошніх могуць (бронь божа!) апынуцца і самі.

## РЭХА ЧАРНОБЫЛЯ

Доктар быў зусім малады, але ж, відаць, дасведчаны. Ва ўсякім разе, гаварыў ён упэўнена, смела, гаварыў, што час упушчаны, што без аперацыі ўжо ніяк, а паколькі пухліна вялікая, то выдаляць яе прыйдзецца разам з усім (то-бок разам з малочнай залозай). Што, вядома ж, крыўдна, бо жанчына яна маладая... Як выйсце, можна паставіць імплант.

— Не, не варта, — усміхнулася яму пацыентка, — бо ніхто, апроч вас, мае грудзі не бачыць.

Раней, да аперацыі, і сапраўды, цяпер, пасля...

Надоечы вось у паліклініку хадзіла: кардыяграму трэ было зрабіць, а найперш сказалі раздзецца.

Яна і пачала — з «прыгаворам», што аперацыю перанесла, што адной залозы няма. Дык вы, маўляў, не пужайцеся...

— Ды было б чаго, — усміхнулася ёй дакторка. — У нас такіх пацыентаў — кожны дзень... А бывае і па некалькі.

## АДЦВІЛІ...

У Галі на дачы проста цуд якія хрызантэмы: жоўтыя, белыя, ружовыя, ці не ўсіх адценняў барвовыя...

— Гэта ўсё ад мамкі маёй, — выхвалялася гаспадыня. — Яна іх вельмі любіла. Каля хаты кустоў з дзесяць расло!

У Галі, напэўна, не менш: усе любаваліся! Але ж гэта — летась, бо сёлета...

У хацінкі яе (так склалася) — новы гаспадар. Агароджа таксама новая — высокая, бетонная.

Што за ёй расце і што цвіце, ужо невядома.

## ЯНЫ ЯК МЫ?

«Хабар» у асабліва дробных памерах — прыяцелька яек прынесла (свой дом у яе, гаспадарка), доўга прабачалася, што толькі дзясятачак, бо восень на дварэ ды і куры старыя: адна кульгавая стала, другая — аблысела...

Выснова (яе):

— Куры — яны як людзі.

## ЁСЦЬ РОЗНІЦА

Горад, праспект, люднае скрыжаванне. *Над* ім — вялікі банер (ён жа транспарант) з заклікам не купляць прадукты з рук, *пад* ім, у падземным пераходзе, яны... ва ўсю прадаюцца. Стыхійны рынак. І чаго там толькі няма: садавіна-гародніна, грыбы, катахі кукурузы, мёд, саленні, сухафрукты, кава-гарбата...

Гандлююць імі пераважна жанчыны (прычым сталага ўзросту) і, як правіла, з перапынкамі, бо «на гарызонце» час ад часу з'яўляецца нарад міліцыі, і гандляркі тады, як птушкі, уздымаюцца з месцаў, мігам хапаюць сумкі з таварам — пускаюцца наўцёк.

Праўда, не ўсе: хто-ніхто і зрэдку — тармозіць, уступае ў перапалку. Вось і зараз вецер даносіць два галасы: міліцэйскі, строгі, і «базарны», жаночы:

— Я сказаў, што гандляваць нельга!

— А пражыць, калі паўпенсіі на лекі пайшло, можна?!

— Я ўсё разумею...

— Ты?.. Што ты можаш разумець са сваёю зарплатай?

...*«Сыты галоднаму не спагадае»*. Галодны сытаму таксама...

## НА ХЛАПЦА СПАДЗЯВАЙСЯ...

Вуліца, пераход, святлафор. На ім і, падобна, вось-вось загарыцца чырвонае. Усе спыняюцца, каб прапусціць машыны, хлопец на ровары — не: як той чорт з табакеркі, ён вынырвае аднекуль з-за спін і...

Віск тармазоў, «выццё» клаксанаў, мацюкі... Але ж, дзякуй богу, пранесла: хлопец жывы і нават вясёлы. Ён стаіць на тым баку вуліцы — пазірае на гэты. Бо тут, сярод нас, пешаходаў, і таксама на ровары, яго дзяўчына: нейкім цудам яна паспела спыніцца...

Што, вядома ж, здзіўляе, бо, едучы следам (і, магчыма, даўно), магла «расслабіцца», магла, давяраючы хлопцу, бяздумна круціць педалі: не глядзець на той святлафор і тады...

Ад вялікай радасці (таго ж супольнага руху) да такой жа вялікай бяды — крок. А часам, магчыма, і менш.

## У ЛЕС... І З ЛЕСУ

У лес — як у храм... Ці... у дарослае жыццё: з марай «адарвацца», надыхацца свабодай, налюбавацца-нацешыцца, нагуляцца, само сабой — і часам найперш — нечага набраць...

З лесу, як з жыцця: з ціхім сумам, што, вядома ж, падыхаў. І палюбаваўся. І нештачка знайшоў, нясеш. Але... да крыўднага мала: хацелася б больш!

Адно суцяшае, што гэта, дасць бог, не апошняя восень, не апошні «паход», што будуць новыя — яшчэ і яшчэ! І ўжо тады...

Кажуць, над адным мястэчкам вельмі доўга дажджу не было, і людзі, каб выпрасіць яго, сышліся на малітву: усе разам, з абразамі...

А дзіця адно — дык нават з парасонам. Бо яно — верыла.

**Валянціна ДОЎНАР.**


**Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Лужки (по генплану № 10), дер. Прилепы, ул. Сосновая, дер. Домашаны, дер. Задомля, ул. Центральная, дер. Малое Залужье Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 29 ноября 2018 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | Продавец и его адрес | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,1500 га № 624883005601000166, дер. Лужки (г. п. № 10);<br>Лот № 2 – площадь 0,1003 га № 624883008301000554 дер. Прилепы, ул. Сосновая (участок № 1);<br>Лот № 3 – площадь 0,1500 га № 624883003601000329, дер. Домашаны;<br>Лот № 4 – площадь 0,0811 га № 624883004601000334, дер. Задомля, ул. Центральная;<br>Лот № 5 – площадь 0,1500 га № 624883006601000140, дер. Малое Залужье |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 20 000 рублей; Лот № 2 – 20 000 рублей; Лот № 3 – 20 000 рублей; Лот № 4 – 20 000 рублей; Лот № 5 – 10 000 рублей; |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики;<br>В) без права предоставления рассрочки |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | дер. Лужки – подъездные пути;<br>дер. Прилепы, ул. Сосновая – подъездные пути, электроснабжение;<br>дер. Домашаны – подъездные пути;<br>дер. Задомля, ул. Центральная – подъездные пути;<br>дер. Малое Залужье – подъездные пути |
| 10 | Ограничения в использовании | Лот 1 – водоохранная зона канала (площадь 0,1500 га);<br>Лот 2 – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт (площадь 0,0011 га);<br>Лот 3 – водоохранная зона реки Плиса (площадь 0,1500 га);<br>Лот 4 – водоохранная зона реки Домелька (площадь 0,0727 га);<br>Лот 5 – водоохранная зона реки Бараневка (площадь 0,1500 га) |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с BY50AKBB36410000006146200000, БИК AKBBBY21612 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ 621 г. Смолевичи УНП 600046563 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварит. ознак. в натуре с зем. участками | Среда в 10.00 |
| 13 | Прием документов | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 14 | Окончательный срок приема документов | 23 ноября 2018 года в 17.00 |
| 15 | Контактные телефоны | 8-01776-9-395, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 974,36 руб., лот 2 – 1702,45 руб., лот 3 – 1833,35 руб., лот 4 – 1926,68 руб., лот 5 – 1617,03 руб. и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицом – документ, удостоверяющий личность (паспорт), и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.



Объявление, напечатанное в № 174 от 11.09.2018, дополнить словами: «филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске № 2. УНП 100706519



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 50 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СВИСЛОЧСКОГО ФИЛИАЛА ГРОДНЕНСКОГО ОБЛПОТРЕБОБЩЕСТВА**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Лот № 1**<br>**Капитальное строение инв. № 413/С-18172** (торговое здание «Универмаг» с подвалом) общей площадью 3870,4 кв. м, кирпичное, двухэтажное, 1989 г. п. Составные части и принадлежности: две террасы, мощение асфальтобетонное площадью 542,0 кв. м, площадка из плитки цементно-песчаной площадью 896,0 кв. м, водопроводная сеть, канализационная сеть, электрическая сеть | | |
| Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Свислочский р-н, г. Свислочь, ул. Ленина, д. 23** | | | |
| Информация о земельном участке | Площадь 0,5356 га, кадастровый номер 425250100001001734, назначение – для размещения объектов розничной торговли. Право аренды по 02.09.2059 год | | |
| Начальная цена | **555 500 руб. 00 коп. с учетом НДС** | Сумма задатка (5 %) | **27 775 руб. 00 коп.** |
| **Сведения о продавце:** Свислочский филиал Гродненского облпотребобщества, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 8 (01513) 32495 | | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов. **Условия оплаты:** по договоренности сторон | | | |
| Торги состоятся 6 ноября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8 | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 31 октября 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by, телефоны для справок: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79 | | | |
| Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 28.08.2018 г. | | | |

100 гадоў Беларуская ССР

# Аляксандр Чарвякоў. «УСЕБЕЛАРУСКІ СТАРАСТА»

## Ён стаў кіраўніком рэспублікі ў 28 гадоў. Праз дзесяцігоддзе «лапцюжная Беларусь» ужо мела нацыянальны ўніверсітэт, Акадэмію навук і развітую гаспадарку

**Яго лёс — цікавы, супярэчлівы і ўрэшце трагічны, мог бы стаць добрай асновай для серыяла на сюжэт з найноўшай гісторыі, якія апошні час стала модна здымаць. За свае сорак пяць ён зрабіў, як бы сёння сказалі, бліскучую палітычную кар'еру, пазнаў усю слодыч і горыч улады, адстойваў сваю пазіцыю і быў вымушаны падпарадкавацца, стараўся застацца на плаве і выжыць, ледзь не трапіў пад страшную машыну рэпрэсій, але змог яе пазбегнуць, сваёй рукой пазбавіўшы сябе жыцця... Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў — першы кіраўнік Савецкай Беларусі. Чалавек, які рупіўся за Беларусь, для якога Беларуская рэспубліка — толькі створанае, новае дзяржаўнае ўтварэнне — не была пустым гукам ці палітычнай гульнёй. Для яго БССР стала, як бы сёння сказалі, перспектыўным праектам, на рэалізацыю якога ён траціў увесь імпэт і сілы, і які ўжо праз некалькі гадоў паспяхова спраўдзіўся.**

## Рэвалюцыя як лёс

Шлях Аляксандра Чарвякова на вяршыню савецкай улады можна назваць тыповым для таго часу. Паходжанне — самае што ні ёсць сялянска-пралетарскае: дзед — прыгонны ткач у пана ў Дукоры Ігуменскага павета (там, у вёсцы Дукорка на сённяшняй Пухавіччыне, у 1892 годзе і нарадзіўся будучы палітык), бацька — малодшы з братоў, не прэтэндаваў на тры дзесяціны зямлі, пакінутыя ў спадчыну на ўсіх, і падаўся ў пошуках лепшай долі ў горад. Сыну ён пастараўся даць адукацыю: Аляксандр скончыў царкоўнапрыходскую школу, а пасля гарадское вучылішча. У сямнаццаць гадоў ён вытрымаў экзамен на званне народнага настаўніка і накіраваўся вучыць вясковых дзяцей у Трокскім павеце пад Вільняй. Там вырашыў стаць настаўнікам дыпламаваным, паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут і паспяхова яго скончыў. І вучыў бы ён дзяцей яшчэ доўгія гады, але... На двары быў 1915 год.

Дваццацітрохгадовага Чарвякова мабілізавалі, але, улічваючы яго адукацыю, накіравалі ў школу прапаршчыкаў. Ён яе паспяхова скончыў, служыў у розных частках. І тут у яго біяграфіі адбылася, на першы погляд, нязначная падзея, але гэта менавіта тое, лёсавызначальнае, што людзі называюць «апынуцца ў пэўным месцы ў пэўны час». Малады прапаршчык атрымаў накіраванне ў Пецярбург, дзе павінен быў прайсці курс у кулямётнай школе. І трапіў у горад акурат 28 лютага 1917-га — Лютаўская рэвалюцыя была ў разгары. Карацей, і пра школу, і пра фронт хлопец, які яшчэ з часоў настаўніцкага інстытута спачуваў рэвалюцыйным ідэям, забыўся і кінуўся ў новую бурлівую стыхію, што віравала вакол. Віравала — і зацягнула. У маі 1917-га ён уступіў у партыю бальшавікоў і прыняў актыўны ўдзел у ліпеньскіх падзеях у Петраградзе.

«Менавіта тады адбылося асабістае знаёмства Аляксандра Чарвякова з тым чалавекам, які доўгія гады будзе яго сябрам і аднадумцам і які ў рэшце рэшт самым ракавым чынам паўплывае на яго лёс, — з Іосіфам Сталіным, — расказвае **загадчык аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук кандыдат гістарычных навук Сяргей ТРАЦЦЯК.** — Адначасова па рэкамендацыі Змітра Жылуновіча прапаршчык Чарвякоў становіцца сябрам Нарвскай арганізацыі Беларускай сацыялістычнай грамады і прымае самы актыўны ўдзел у стварэнні на яе базе Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі — беларускай секцыі партыі бальшавікоў у Петраградзе. Восенню 1917 года Чарвякоў у складзе Беларускага бежанскага камітэта не толькі дапамагае землякам, якія ўцяклі ад жахаў вайны, але і тлумачыць ім, чаму так важна запаліць пажар рэвалюцыі».



Аляксандр ЧАРВЯКОЎ *(справа)* з сялянамі.

## Імклівы ўзлёт

Актыўнага адукаванага маладога чалавека заўважылі, і пасля кастрычніцкіх падзей, ужо ў лютым 1918 года, ён быў прызначаны на пасаду камісара па беларускіх справах пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў РСФСР. Летам 1918-га быў у парадку партыйнай мабілізацыі прызначаны камісарам адной з чырвоных дывізій, але камісарская кар'ера не задалася: па дарозе да месца службы цягнік пацярпеў крушэнне, і Чарвякова вызвалілі ад пасады «з-за атрыманых удараў». Але без справы ён не застаўся: атрымаў месца загадчыка культурна-асветніцкага аддзела ва Усерасійскім бюро ваенных камісараў пры УЦВК, пры гэтым застаючыся членам Цэнтральнага бюро беларускіх камуністычных секцый пры ЦК РКП(б).

Не дзіўна, што калі ў Маскве прынялі рашэнне аб стварэнні незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, згадалі і пра Чарвякова — праверанага таварыша, перакананага камуніста, які, сам беларус, будзе так за свайго, але не збочыць з лініі партыі. Аляксандр Рыгоравіч у якасці члена Часовага работніча-сялянскага ўрада навастворанай рэспублікі ставіць подпіс на маніфесце аб яе стварэнні і становіцца народным камісарам асветы (як на сёння — міністрам адукацыі).

Як вядома, ССРБ у версіі студзеня 1919 года праіснавала нядоўга: у хуткім часе была створана ССР Літвы і Беларусі, у кіраўніцтве якой не было ніводнага беларуса. Чарвякоў застаўся на пасадзе намесніка камісара асветы Літбел. Рэспубліка сцякала крывёю ў барацьбе з польскімі інтэрвентамі. Пасля падзення 9 жніўня 1919 года Мінска, пераехаўшы ў Смаленск, Аляксандр Рыгоравіч стаў працаваць у штабе Заходняга фронту.

Пасля вызвалення 11 ліпеня 1920 года Мінска ад палякаў кар'ера Аляксандра Чарвякова панеслася ўгару з шалёнай, нават па тым часе, хуткасцю: спачатку старшыня Мінскага губернскага, а пасля Беларускага рэвалюцыйнага камітэта — органа, на які было ўскладзена аднаўленне савецкай улады на вызваленых тэрыторыях Беларусі. 31 ліпеня 1920 года Чарвякоў урачыста абвяшчае аднаўленне дзяржаўнасці ССРБ. А 18 снежня 1920 года на II з'ездзе Саветаў Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў быў абраны старшынёй ЦВК і СНК ССРБ (парламента і ўрада юрыдычна суверэннай на той час рэспублікі). Яму было 28 гадоў.

## Ад шасці паветаў да «чырвонай Даніі»

Тое, якая гэта адказнасць — кіраваць краінай, пра якую яшчэ да нядаўняга часу ніхто не чуў, якія намаганні трэба прыкласці, каб і з краінай, і з яе кіраўніком лічыліся, Чарвякоў даволі зразумець яшчэ да гэтага афіцыйнага прызнання, увосень 1920-га, калі ў Рызе пачаліся перагаворы з Польшчай аб заключэнні міру. Беларусь туды (як было ўжо і падчас заключэння Брэсцкага міру) паклікаць не палічылі патрэбным, хоць размова мелася весціся менавіта аб падзеле беларускіх тэрыторый. І Чарвякоў накіроўваецца ў Рыгу амаль інкогніта, і там яго ніхто не хоча слухаць. «Горш за ўсё, што падзел Беларусі быў ужо прадвызначаны і што маё добрае беларускае імя скампраментавана назаўжды», — піша ён у Мінск таварышам па Белрэўкаме. З-за нявызначанасці статусу Чарвякова перагаворы на час спыняюцца: прадстаўнік Польшчы Ян Домбскі заяўляе: «Я бачу ў спісе прадстаўніка нейкай міфічнай дзяржавы. Пакуль мы не пераканаемся ў законнай сіле паўнамоцтваў усіх дэлегатаў, правядзенне перагавораў лічу немагчымым...» Чарвякоў з'ехаў, перагаворы перапынілі, а мірны дагавор, згодна з якім «нашу Айчыну без нашае волі як тую аўчыну ў шматкі папаролі», падпісалі ў сакавіку 21-га. Беларуская ССР у дакуменце фігуравала — падпісацца за яе быў упаўнаважаны ўрад РСФСР...

Чарвякоў застаўся кіраўніком шасці паветаў — вялікія тэрыторыі ўсходніх абласцей былі далучаны да Расіі. І вось тут ён праявіў сябе як асцярожны і мудры палітык, падкрэслівае Сяргей Трацццяк. Размову аб тым, каб вярнуць Беларусі раёны Гомельшчыны, Магілёўшчыны, Віцебшчыны ён пачаў актыўна весці тады, калі ўжо быў утвораны СССР (у 1922 годзе), калі пытанне тэрытарыяльнай прыналежнасці той ці іншай рэспублікі ўжо не стаяла так востра — бо ўсе ж фактычна былі ў адной дзяржаве. У справе вяртання ўсходнебеларускіх тэрыторый Савецкай Беларусі саюзнікам Чарвякова выступіў Сталін, удакладняе гісторык. Першае ўзбуйненне БССР адбылося ў 1924 годзе — тэрыторыя ў выніку першага ўзбуйнення павялічылася да 110 584 км², а насельніцтва — да 4,2 млн чалавек. Другое ўзбуйненне з далучэннем Гомельскага і Рэчыцкага паветаў адбылося ў 1926 годзе. У старых савецкіх падручніках гэта тлумачылася неабходнасцю ўзмацніць нацыянальна-вызваленчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Але насамрэч была яшчэ адна прычына — гэта быў своеасаблівы «прыз» кіраўніцтву БССР і найперш Аляксандру Чарвякову за поспехі ў развіцці рэспублікі.

Да гэтага часу ў рэспубліцы, на тэрыторыі якой падчас перапісу 1897 года было менш як 15 працэнтаў пісьменных, ужо стварылі нацыянальны ўніверсітэт, прызваны рыхтаваць нацыянальныя навуковыя і выкладчыцкія кадры. Распачаў работу Інстытут беларускай культуры — папярэднік нацыянальнай Акадэміі навук. Паспяхова ішла барацьба з непісьменнасцю. Сяляне сталі жыць заможна — рэалізацыя ідэі «чырвонай Даніі» (пра яе і пра яе энтузіяста Дзмітрыя Прышчэпава мы раскажам у іншай публікацыі рубрыкі) пачала даваць плён. У маі 1925-га на VII з'ездзе Саветаў БССР Чарвякоў прамовіў: «Багацей, селянін, здабывай больш багацця, і чым больш ты будзеш багаты, тым больш багатая будзе наша Савецкая рабоча-сялянская дзяржава». Актыўна ішла беларусізацыя — людзей проста выцягвалі з лапцей, ад лучыны, даючы зразумець, што і мова іхняя — не мужыцкая, што яны самі вартыя лепшай долі.

Усё гэта (канешне, не адступаючы ад генеральнай лініі партыі) Аляксандр Чарвякоў выклаў у праграмным артыкуле «За Савецкую Беларусь» (яго публікавала «Звязда» ў 1927 годзе). І думкі ў маладога палітыка сягалі далёка, і разуменне таго, пра што мы на ўсіх узроўнях гаворым сёння, у яго было ўжо тады: «Беларусь знаходзіцца на пераходным этапе ад Расіі да Заходняй Еўропы. У Еўропе капіталістычная гаспадарка, якой няма ў Расіі, але ёсць у Беларусі».

## «Правы ўхіл», якога не даравалі

Людзі яго разумелі і любілі. Не толькі таму, што рупіўся для іх, але і таму, што сам, як сведчылі сучаснікі, заставаўся простым чалавекам. Максім Іўчанін згадваў: «Сведкі яго падарожжа па Полаччыне могуць успомніць і пацвердзіць. Машыну даводзілася часта спыняць. Згледзеўшы яе здалёк, уперарак дарогі кляліся дзядзькі і накрывалі галаву паперай, дзе былі спісаны ўсе мужыцкія крыўды. І Чарвякоў кожны раз выходзіў сам, браў заяву, падымаў з зямлі чалавека... і падвозіў да вёскі ці раёна».

Усё гэта — і не зусім сацыялістычныя рэформы, і «простасць» — яму прыпомняць вельмі хутка. У 1929 годзе Сталін выступіў на красавіцкім пленуме ВКП(б) з прамовай аб правым ухіле ў партыі. Цэнтральнае бюро КП(б)Б загадвае Чарвякову тэрмінова падвергнуць «свае праваапартуністычныя ўстаноўкі прамой, рашучай, бальшавіцкай самакрытыцы», і ў снежні ён піша ў «Звязду» пакаянны артыкул «Бальшавіцкай самакрытыкай выправім свае памылкі».

Чарвякоў прызнаваў свае дзеянні ў нацыянальнай палітыцы памылковымі, а эканамічныя захады, якія праводзіліся, — шкодніцкімі. Яшчэ праз некалькі дзён ён піша заяву ў Маскву, дзе ставіць пытанне аб немагчымасці далейшай працы і сваім адкліканні з Беларусі. Прашэнне старшыні ЦВК БССР адхіляюць: няхай, маўляў, сам і выпраўляе свае памылкі.

І працягваюць цкаваць. У 1930 годзе фабрыкуецца справа аб «Саюзе вызвалення Беларусі», у якой фігуруюць выдатныя дзеячы нацыянальнай навукі і культуры, многіх з якіх Чарвякоў у свой час запрасіў вярнуцца ў Беларусь з-за мяжы. Чарвякова абвінавачваюць ні больш ні менш як у патуранні антысавецкай дзейнасці. У пратаколе XIII з'езда КП(б)Б, які праходзіў у 1930 годзе, захаваліся з'едлівыя словы сакратара Мінскага акружкама Адама Славінскага: маўляў, Чарвякоў «лепш разбіраецца ў пытаннях Беларускай сацыялістычнай грамады і «Нашай Нівы», чым у пытаннях ленінізму».

І Чарвякоў... ламаецца (ці спрабуе выжыць? — не нам судзіць). Такой ашалелай палітыкі калектывізацыі не праводзілася, пэўна, нідзе ў Саюзе. Раскулачвалі і вывозілі людзей цэлымі вёскамі (бо сяляне, дзякуючы палітыцы сярэдзіны 20-х, сталі заможнымі — сапраўднымі кулакамі)... І ўжо наваствораныя беларускія калгасы рапартавалі аб рэкордных ураджаях, а Купала, таксама паламаны ў 30-м, захоплена пісаў «Над ракой Арэсай» ды «Вечарынку ў калгасе»...

Не дапамагло. Надышоў страшны 37-ы год, калі ўсім прыпаміналі былыя «грахі». У чэрвені распачынаецца XVI з'езд кампартыі Беларусі. Яе тагачасны кіраўнік Васіль Шаранговіч ужо мае рэзалюцыю Сталіна: «Не перашкаджаць з'езду пракуціць Чарвякова». Гэта значыць — старшынёй ЦВК яму ўжо не быць. І можна проста з трыбуны з'езда абвінавачваць яго і ў правым ухіле, і ў тым, што не змагаецца з ворагамі народа, і ў цёплых адносінах да «нацдэмаўцаў». Усе ведаюць, што на той час расстрэльны прыгавор. Але гэта нікога не спыняе: усе выступоўцы (у тым ліку і Шаранговіч) спяшаюцца выказаць сваё асуджэнне і абурэнне — кожны спрабаваў выратаваць сябе. Чарвякоў падымаецца на трыбуну, але яму не даюць гаварыць — у пратаколе з'езда зафіксавана, што яго перарывалі больш за сто разоў. У перапынку ён ідзе ў свой кабінет... выстрал... Яму было 45... Шаранговіч (яму самому заставалася жыць некалькі месяцаў, у сакавіку 38-га ён будзе расстраляны) увечары аб'явіць на з'ездзе, што Чарвякоў скончыў жыццё самагубствам па «асабістых сямейных прычынах». А ў «Звяздзе» на апошняй старонцы ў самым нізе паласы будзе лаканічна напісана: «Учора ў 7 гадзін вечара было пахавана цела старшыні ЦВК БССР А. Г. Чарвякова, які паконччыў жыццё самагубствам на асабістай сямейнай глебе»...

* * *

Яго пахавалі на Вайсковых могілках. А праз трыццаць гадоў пасля гібелі яго імем назвалі адну са сталічных вуліц.

Ці думаў ён пра гэта? Ці пра гэта марыў, калі выводзіў назву праграмы свайго жыцця — "За Савецкую Беларусь"?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# Анатоль СІВАК: «МЫ ДЗВЮМА РУКАМІ ЗА БЕЗДАЗВОЛЬНУЮ СІСТЭМУ»


Фота БелТА.

**Мінтранс Беларусі зацікаўлены ў тым, каб перайсці на бездазвольную сістэму з трэціх краін для перавозчыкаў у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. Такую пазіцыю агучыў міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК.**

Ён нагадаў, што ў рамках ЕАЭС падпісана адпаведнае пагадненне, згодна з якім такія дазволы з 2025 года будуць непатрэбныя. «Хацелася б, каб мы дасягнулі таго, пра што дамаўляліся ў ЕАЭС, хоць бы да 2025 года. Але нашы пажаданні — і раней», — сказаў Анатоль Сівак. Прэс-канферэнцыя была прысвечана развіццю транспартнай інфраструктуры і планам да 2020 года.

## Аўтамабілі

Летась набыта звыш 340 аўтобусаў (у тым ліку 20 электробусаў у Мінску) і 40 тралейбусаў. Для павышэння хуткасцяў руху гарадскога пасажырскага транспарту вядуцца работы па арганізацыі выдзеленых палос для руху аўтобусаў і тралейбусаў на вуліцах Мінска і Брэста.

Прыпыначныя пункты пасажырскага транспарту ў Мінску, Гомелі і Брэсце паэтапна абсталююцца электроннымі інфармацыйнымі табло. Удасканальваюцца тэхнічныя сродкі аўтаматызаванага кіравання рухам гарадскога пасажырскага транспарту. Ажыццяўляецца будаўніцтва трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна.

## Водны транспарт

Міністр адзначыў, што ў найбліжэйшыя гады плануецца пачаць рэканструкцыю суднаходных шлюзаў «Перасекчы» і «Оўзічы» на Дняпроўска-Бугскім канале, будаўніцтва Усць-Ветліцкага гідравузла, а таксама будаўніцтва базы тэхнічнага абслугоўвання суднаў у верхнім б'ефе Гродзенскай ГЭС.

Сёлета прыняты на баланс пабудаваны ў рамках будаўніцтва Віцебскай ГЭС суднаходны шлюз на рацэ Заходняя Дзвіна. Падыходзіць да завяршэння рэканструкцыя суднаходнага шлюза «Рагадошч» на Дняпроўска-Бугскім канале, а таксама будаўніцтва прычалаў мінеральна-будаўнічых грузаў рачнога порта за межамі горада Брэста «Ямна».

## Авіяцыя

Сёлета завершана рэалізацыя трох этапаў інвестыцыйнага праекта па абнаўленні парку паветраных суднаў. Плануецца завяршэнне будаўніцтва ў Нацыянальным аэрапорце Мінск другой штучнай узлётна-пасадачнай паласы.

Да будаўніцтва новага пасажырскага тэрмінала ў Нацыянальным аэрапорце Мінск плануецца прыступіць пасля завяршэння II Еўрапейскіх гульняў.

## Дарожная гаспадарка

На мясцовых аўтамабільных дарогах у бягучым годзе плануецца завяршыць рэканструкцыю на 7 кіламетрах дарог і 106 пагонных метрах мастоў, выканаць бягучы рамонт 1725 км дарог і 325 пагонных метраў мастоў.

Налета будзе працягвацца работа па рэканструкцыі аўтамабільнай дарогі М-6 Мінск — Гродна — мяжа Польшчы (Брузгі). З Еўрапейскім інвестыцыйным банкам прапрацоўваецца пытанне па фінансаванні рэканструкцыі аўтамабільнай дарогі М-7 Мінск — Ашмяны — мяжа Літвы (Каменны Лог).

Цяпер прапрацоўваецца пытанне развіцця аўтамагістралі Санкт-Пецярбург — Мінск. Яе стварэнне дазволіць скараціць адлегласць паміж гэтымі гарадамі на 132 км у параўнанні з традыцыйным маршрутам. Па тэрыторыі краіны маршрут прапануецца пракласці ад Мінска па аўтамабільнай дарозе М-3 Мінск — Віцебск (да Лепеля), далей па Р-46 Лепель — Полацк — мяжа Расійскай Федэрацыі (Юхавічы) праз Полацк да мяжы з Расіяй з выхадам на аўтамабільную дарогу А-117.

## Мост адкрыюць да 7 лістапада

Адказваючы на пытанні журналістаў, міністр транспарту і камунікацый адзначыў, што рух па мосце праз раку Прыпяць у Жыткавіцкім раёне адкрыюць да 7 лістапада.

Рух па гэтым мосце быў закрыты на год у снежні 2017 года. Па словах Анатоля Сівака, задача па яго ўводзе ў эксплуатацыю будзе выканана ў тэрмін. «Прыпяцкі мост практычна завершаны. Да лістапада ён будзе ўведзены ў эксплуатацыю. Дакладней, нават будзе адкрыты рух па гэтым мосце», — сказаў міністр. Таксама фактычна завершаны работы па мосце праз Сож (траса М-8 — мяжа Расіі — Віцебск — Гомель — мяжа Украіны). Анатоль Сівак адзначыў, што стан маставых збудаванняў сёння з'яўляецца адным з прыярытэтных пытанняў для Мінтранса. Ён нагадаў, што ў цэлым у Беларусі стаіць задача па рэканструкцыі 32 мастоў.

## Хуткасны трамвай да «Вялікага каменя»

Мінтранс выступае з прапановай, каб на трасе ў напрамку Нацыянальнага аэрапорта Мінск, якая пройдзе праз Беларуска-кітайскі індустрыяльны парк, быў прадугледжаны шлях для хуткаснага трамвая. Гаворка ідзе пра будаўніцтва дарогі ў працяг вуліцы Ваўпшасава.

«Пакуль гэта нават не перадпраектная прапрацоўка, — падкрэсліў Анатоль Сівак. — Ідзе абмеркаванне ў цэлым канструкцыі такой дарогі. Мінтранс, напрыклад, выступае з прапановай, каб гэтая дарога будавалася не проста як аўтамабільная, але каб там адразу будаваўся шлях для хуткаснага трамвая на падзяляльнай паласе». Міністр звярнуў увагу, што пакуль такога аб'екта няма ў праграме «Дарогі Беларусі». Цяпер толькі абмяркоўваецца пытанне аб уключэнні яго ў згаданую праграму і хто будзе выступаць заказчыкам», — сказаў ён, адзначыўшы, што казаць пра тэрміны рэалізацыі гэтага праекта заўчасна.

**Сяргей КУРКАЧ.**



## Паважаныя калегі!

## З Днём аўтамабіліста і дарожніка!

Гэта прафесійнае свята аб'ядноўвае шматлікі атрад людзей дастойнай і паважанай прафесіі. Наша прадпрыемства мае 17 філіялаў, у якіх працуе каля 1 тысячы 600 чалавек. Мы абслугоўваем амаль 11 тысяч кіламетраў дарог.

Штогод у вобласці мадэрнізуюцца існуючыя і будуюцца новыя аўтамабільныя дарогі, узводзяцца дарожныя збудаванні, забяспечваецца бесперабойны рух аўтамабільнага транспарту. Наша праца патрабуе вялікага прафесійнага майстэрства, вынослівасці і аптымізму. Але без нас не абысціся, бо жыццё сучаснага чалавека і ўсяго грамадства немагчыма ўявіць без транспартнага абслугоўвання. А гэта можна здзейсніць толькі пры наяўнасці адпаведных дарог.

Ад якасці пракладзенага шляху залежыць многае, таму наш калектыў працуе над тым, каб пабудаваныя і адрамантаваныя намі дарогі служылі як мага даўжэй.

А нам давяраюць будаваць і рамантаваць дарогі не толькі рэгіянальнага, але і рэспубліканскага значэння. Гэта патрабуе высокага прафесіяналізму, таму калектыў пастаянна асвойвае новыя метады, працуе з самымі сучаснымі матэрыяламі.

Калегі! Віншую вас з прафесійным святам. Упэўнены, што дзякуючы вопыту, высокаму прафесіяналізму і адказным адносінам да справы нашы дарожнікі па-ранейшаму будуць рабіць значны ўнёсак у фарміраванне новага аблічча дарожнай сеткі рэгіёна і усёй краіны. Дарога — гэта не толькі сімвал высокіх імкненняў, але і ўвасабленне жыццёвага шляху. Няхай у кожнага з вас гэты шлях будзе светлы, а дарога — шырокая і роўная.

**Генеральны дырэктар КУП «Гроднааблдарбуд» Дзмітрый ВАЛКОВІЧ.**

УНП 500036511.

## Дарогі — гэта жыццё

*Віцебская вобласць — адзін з маляўнічых куткоў Еўропы. Каб дарогі «маленькай краіны» — Прыдзвіння былі бяспечныя, хуткасныя, штодня плённа працуе вялікая і дружная каманда Прафесіяналаў з вялікай літары РУП «Віцебскаўтадар».*

*Сёлета калектыў гэтага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства аўтамабільных дарог адзначыў 20-ю гадавіну дзейнасці.*

*І напярэдадні прафесійнага свята дарожнікаў ёсць нагода ўспомніць пра плённую дзейнасць.*

*Віцебская вобласць па сваім геаграфічным становішчы знаходзіцца на скрыжаванні транспартных маршрутаў. Дванаццаць дарог, якія абслугоўваюцца Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам аўтамабільных дарог «Віцебскаўтадар», выходзяць на знешнія межы Беларусі і з'яўляюцца найважнейшай часткай яе транспартнай сістэмы. Бо яны забяспечваюць унутраныя і транзітныя аўтаперавозкі з Расіяй і краінамі Балтыі.*

*Адзінаццаць філіялаў дарожна-эксплуатацыйных упраўленняў з паркам сучаснай высокапрадукцыйнай дарожна-будаўнічай тэхнікі, машынамі і механізмамі забяспечваюць круглагадовае ўтрыманне больш як трох тысяч кіламетраў (!!!) рэспубліканскіх аўтадарог. Яны ж выконваюць комплекс работ па бягучым рамонце. Іх вытворчыя базы дазваляюць стварыць для работнікаў належныя ўмовы працы.*

*Супрацоўнікі РУП «Віцебскаўтадар» бралі ўдзел у стварэнні і рэканструкцыі вельмі важных аб'ектаў транспартнай інфраструктуры Прыдзвіння і Беларусі ў цэлым.*

*У прыватнасці, працавалі над стварэннем паўднёва-заходняга абыходу горада Віцебска. У спісе знакавых аб'ектаў таксама: аўтамабільная дарога М-3 Мінск — Віцебск (88—126 км); аўтамабільная дарога Р-20 Віцебск — Полацк — мяжа Латвійскай Рэспублікі (10—63 км); аўтамабільная дарога Р-21.*

*«Віцебскаўтадар» многае зрабіў для абнаўлення іншых дарог, па якіх штодня едуць дзясяткі тысяч аўто.*

*Дзякуючы зладжанай рабоце працоўных калектываў ДЭУ ўдаецца забяспечваць бяспечны і бесперабойны рух транспарту на замацаванай сетцы аўтамабільных дарог.*

*Нягледзячы на складанасці, калектыў «Віцебскаўтадара» з аптымізмам глядзіць у будучыню і памятае пра тое, што ў розныя часы будаўніцтва і рамонт аўтамабільных дарог з'яўляліся генератарам эканамічнага развіцця дзяржаў!*

*Шчыра віншую сваіх калег са святам дарожнікаў. Асабліва падкрэсліваю ўклад ветэранаў працы, якія старанна працавалі, каб дарогі Віцебшчыны былі бяспечнымі.*

*Здароўя ўсім работнікам «Віцебскаўтадара», іх родным. Няхай праца прыносіць задавальненне, а дома каб быў надзейны тыл, паразуменне. У нашым прадпрыемстве, як кажуць, выпадковыя людзі не працуюць. Мы цэнім тых, хто адчувае прафесійную адказнасць за тое, што імі зроблена! Шчыра віншую і нашых калег, з якімі мы робім агульную справу!*

***З павагай, генеральны дырэктар РУП «Віцебскаўтадар» Адам КАНОПЛІЧ.***

УНП 300582165.



## САРДЭЧНА ВІНШУЮ КАЛЕКТЫЎ КУП «МАГІЛЁЎАЎТАДАР» І ЎСІХ, ХТО МАЕ ДАЧЫНЕННЕ ДА ПРАФЕСІІ ДАРОЖНІКА, З ПРАФЕСІЙНЫМ СВЯТАМ!

Працаваць на такім прадпрыемстве, як «Магілёўаўтадар», вельмі ганарова і ў той жа час адказна. Ад нашай руплівасці і самаадданасці залежыць якасць дарог Магілёўскай вобласці. Мы робім прыгожымі і зручнымі нашы населеныя пункты, ствараем дарожную інфраструктуру гарадоў, раённых цэнтраў, вёсак, пад'езды да асобна ўзятых дваровых тэрыторый.

Дарогі — гэта жывыя артэрыі краіны, і ад таго, наколькі дынамічна і вольна пульсуе па іх жыццё, рухаецца транспарт, залежыць дабрабыт усіх жыхароў вобласці і ў цэлым краіны.

Шчыра жадаю вам моцнага здароўя і шчасця на доўгія гады, поспехаў і дастатку, удачы і добрага настрою вам і вашым сем'ям.

Хай здзяйсняюцца самыя запаветныя мары і жаданні, добрага вам плёну ў працы і дабрабыту ў сямейных справах.

***Генеральны дырэктар КУП «Магілёўаўтадар» Анатоль ЛАПАЦІН.***

УНП 700437908.



## ПАВАЖАНЫЯ РАБОТНІКІ ДАРОЖНАЙ ГАЛІНЫ, ВЕТЭРАНЫ-ДАРОЖНІКІ!

Прыміце самыя цёплыя і сардэчныя віншаванні з наступаючым прафесійным святам!

Значэнне дарог цяжка пераацаніць. Добрая дарога — гэта добраўпарадкаванае жыццё, паўнакроўныя эканамічныя стасункі гарадоў і вёсак, абласцей і раёнаў, гэта, у рэшце рэшт, культура нашага побыту. Менавіта з дарог пачыналася ў далёкай старажытнасці цывілізацыя.

Шануючы ўсё, што зроблена папярэднікамі, мы ўсведамляем сваю місію па далейшым развіцці дарожнай гаспадаркі, павышэнні якасці будаўніцтва і ўтрымання дарог. Таму ў дарожнай галіне працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, умелыя і адказныя рабочыя. Адна з традыцый, якімі багатыя нашы калектывы — гэта захопленасць сваёй справай, беражлівыя адносіны да ведаў і вопыту, перадача іх ад пакалення да пакалення. Відавочна, што гэта пераемнасць і з'яўляецца залогам поспеху адной з найважнейшых галін народнай гаспадаркі Беларусі.

Дарагія дарожнікі нашай краіны! Ад усёй душы віншую вас з прафесійным святам! Жадаю работнікам галіны працоўнага плёну і дабрабыту, ветэранам — здароўя і аптымізму, а ўсім нам — простага чалавечага шчасця.

**Ад імя калектыву ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 4 г. Брэст» генеральны дырэктар Ігар ШУГАЕЎ.**

УНП 200274482.

# ПРАДПРЫЕМСТВА ЯКАСЦІ



**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства аўтамабільных дарог «Мінскаўтадар-Цэнтр» шмат гадоў забяспечвае належны транспартна-эксплуатацыйны стан аўтадарог агульнага карыстання Мінскай вобласці і гарантуе бяспечны рух па іх транспартных сродкаў з устаноўленымі хуткасцямі. Прадпрыемства вядомае высокай якасцю сваіх работ, выкананнем усіх узятых на сябе абавязацельстваў, пастаянным імкненнем да новых дасягненняў і цёплым стаўленнем да людзей.**

## ДА ДНЯ ДАРОЖНІКА — З НОВЫМІ ПОСПЕХАМІ!



Генеральны дырэктар Мікалай Мікалаевіч МАЦЮК.

**Генеральны дырэктар РУП «Мінскаўтадар-цэнтр» Мікалай МАЦЮК** расказаў аб бягучай і будучай рабоце свайго прадпрыемства:

— Зараз мы займаемся рэалізацыяй вельмі значных аб'ектаў у нашай краіне. Гэта перш за ўсё траса М-6 Мінск — Гродна працягласцю 154 кіламетры. Таксама мы пачалі рэканструкцыю часткі другой кальцавой дарогі М-14, якая пачынаецца ад Кургана Славы і падыходзіць да Астрашыцкага Гарадка. У перспектыве нам трэба будзе прапрацоўваць пытанне пачатку рэканструкцыі трасы М-7 — гэта дарога на Вільнюс. Таксама ў перспектыве рэканструкцыя дарогі Р-53, ад Кургана Славы да Смалявіч. Прапрацоўваецца пытанне аб рэканструкцыі дарогі М-3, ад мяжы горада да Віцебскай вобласці. Ёсць і іншыя, не менш значныя аб'екты.

Працы хопіць усім, калектыў загружаны, і ў далейшым разглядаецца павелічэнне аб'ёму работ.

***— 28 кастрычніка мы будзем адзначаць Дзень дарожніка — наша прафесійнае свята,*** — дадаў Мікалай Мікалаевіч. — ***Усіх супрацоўнікаў я шчыра віншую з гэтым святам. Жадаю дабрабыту, сямейнага шчасця, працоўных поспехаў і ўсяго найлепшага!***



Тросавая агароджа на аўтадарозе М-5 Мінск — Гомель.

## УТРЫМАННЕ ДАРОГ — КРУГЛЫ ГОД

**Намеснік начальніка ўпраўлення вытворчых работ і ўтрымання дарожнай сеткі Ірына БЕНЕДЗІКТОВІЧ** падрабязна і цікава расказала аб рабоце свайго аддзела.

— Наша ўпраўленне займаецца ўтрыманнем і бягучым рамонтам аўтамабільных дарог. Праца рамонтнікаў залежыць ад сезоннасці. Узімку — гэта барацьба з зімовай слізкасцю, апрацоўка дарожнага пакрыцця супрацьгалалёднымі матэрыяламі. Вясна — гэта падрыхтоўка аўтадарог да эксплуатацыі ў вясенне-летні перыяд. Мы павінны пачысціць ад іржы і пафарбаваць усе бар'ерныя агароджы, адрамантаваць лаўкі і скрыні на аўтапавільёнах, на пляцоўках адпачынку, прыбраць рэшткі процігалалёдных матэрыялаў, якіх за зіму засыпаецца даволі шмат.



Супрацоўнікі ўпраўлення вытворчых работ і ўтрымання дарожнай сеткі.
Злева направа: Алег ЧАЛКІН, Ірына БУРНОС, Ірына БЕНЕДЗІКТОВІЧ (намеснік начальніка), Кацярына КУЦ.

Улетку ідзе абкошванне і рамонт дарожнага пакрыцця. Пры бягучым рамонце ўкладваецца тонкі пласт да 3,5 сантыметра, альбо робіцца павярхоўная апрацоўка. На гэты год планавалася адрамантаваць 106 кіламетраў дарог. Адрамантавана каля 100 кіламетраў. Засталося трошкі работ па дарозе М-4 Мінск — Магілёў і М-5 Мінск — Гомель. Плануем, што ўсё гэта скончым, пакуль надвор'е спрыяе нам.

У летні перыяд аднаўляецца гарызантальная разметка на ўсёй сетцы дарог. Яна складае ў нас больш за 3000 кіламетраў, і мы павінны ўсюды абнавіць «вось», гэта абавязкова. Акрамя таго, трэба абнаўляць краявыя разметкі, там, дзе знос складае больш за 50 %. Таксама неабходна абнаўляць разметку пешаходных пераходаў.

— За гэты год мы пафарбавалі 121 кіламетр бар'ерных агароджаў, — працягвае Ірына Аляксандраўна. — Ачысцілі ад бруду 144 кіламетры бар'ерных агароджаў. Ёсць яшчэ ацынкаваныя агароджы, якія трэба вымыць, — гэта 630 кіламетраў. Фарбуем стойкі дарожных знакаў — амаль 19 000 штук. Афарбоўваем каля 1000 аўтапавільёнаў за вясновы сезон. Прафілюем яшчэ і абочыны — больш за 3000 кіламетраў. Чысцім паласу адводу ад смецця — гэта па некалькі разоў за месяц.

Па бягучым рамонце мы таксама ўсталёўваем і мяняем бар'ерныя агароджы. Усталёўваем мы іх цяпер у асноўным на раздзяляльнай паласе. Па патрабаваннях нашых нарматыўных дакументаў і па патрабаваннях ДАІ, калі гэта дарога 1-й катэгорыі, неабходна, каб на раздзяляльнай паласе стаяла ўтрымлівальная агароджа. Мы ставім альбо трос, альбо бар'ерную агароджу — так, каб яно спалучалася. Актыўна ўкараняем найноўшыя распрацоўкі. Напрыклад, зараз ставілі на трасе М-5 Мінск — Гомель на пяцідзясятым кіламетры тросавую агароджу апошняй, звышнадзейнай канструкцыі.

Па даручэнні Савета Міністраў намі было праведзена шмат работ па азеляненні прылеглай да аўтамабільных дарог тэрыторыі. У супрацоўніцтве з ляснымі гаспадаркамі і мясцовымі органамі ўлады мы высаджвалі кусты, хвойныя і ліставыя дрэвы. Гэтая работа будзе працягвацца ўвесь кастрычнік.

Таксама вялікая работа праводзіцца па зваротах грамадзян. Дзесьці аўтобусная прыпынку не хапае, дзесьці павільёна на аўтобусным прыпынку. Па меры паступлення фінансаў, якія выдзяляе дзяржава, мы стараемся задаволіць усе патрэбы грамадзян.

Увосень мы нарыхтоўваем супрацьгалалёдныя матэрыялы, заканчваем рамонтныя работы і кансервуем пакрыццё пад эксплуатацыю ў зімовы перыяд.

Зараз, напярэдадні зімовага сезону, ідзе актыўная нарыхтоўка пясчана-салянай сумесі (ПСС). Трэба нарыхтаваць 125 тысяч тон ПСС і 55 тысяч тон чыстай солі. Дарогі апрацоўваюцца альбо чыстай соллю, альбо ПСС. Там, дзе ўжываецца ПСС, ідзе перамешванне, складанне ў штабелі і ўкрыццё плёнкай, каб зберагчы сумесь ад атмасферных ападкаў.



Упраўленне бухгалтарскага ўліку і рэвізійнай работы.
Злева направа: Святлана ТАЛКАЧОВА, Святлана ЛАЗАВІК, Ганна ШЫШЛАВА, Людміла ЯФІМЕНКА, Андрэй ЛАБКОВІЧ (гал. бухгалтар), Вера ГРАЧЫШКІНА, Тамара ЛЕМЕШ, Жанна АЗАРАВА.

# І ВЫСОКІХ ДАСЯГНЕННЯЎ



Спецыялісты ДЭУ № 5 філіяла «Мінскаўтадар-Цэнтра» праводзяць ямачны рамонт цэментна-бетоннага пакрыцця аўтадарогі М-3 Мінск — Віцебск. Справа налева: Святаслаў ВОЛАГДЗІН (майстар), дарожныя рабочыя Міхаіл СКАВІНСКІ і Аляксандр ШАВЕЙКА.

## УСЁ, ШТО ЗАПЛАНАВАНА, БУДЗЕ ВЫКАНАНА



Галоўны інжынер Сяргей ІСАКАЎ распавядае пра геасетку айчыннай вытворчасці, якая замяняе 15-сантыметровы слой гравійна-пясчанай сумесі.

**Галоўны інжынер РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр» Сяргей ІСАКАЎ** падзяліўся планамі адносна далейшай дзейнасці.

— Вялікія планы ў нашага прадпрыемства па ўводзе ў эксплуатацыю ўчасткаў дарогі Р-23 Мінск — Мікашэвічы. Таксама зараз пачынаецца інтэнсіўная работа па трасе Р-80 Слабада — Навасады. Вырашаецца праблема фінансавання з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, каб падрадчыкі своечасова атрымалі грошы і маглі пачаць працаваць больш інтэнсіўна.

У нас ёсць маштабныя планы, звязаныя з праектаваннем. Мы працуем з праектным інстытутам «Белдзіпрадар» па распрацоўцы праекта абгрунтавання інвестыцый па рэканструкцыі аўтамабільнай дарогі М-3, ад Мінска да мяжы з Віцебскай вобласцю. Гэта адзін з напрамкаў, які яшчэ застаўся неахоплены. На М-3 мы дайшлі да 40-га кіламетра. М-3 — гэта адна з тых дарог, якія маюць складаны рэльеф. Трэба прыкласці шмат сіл і ўмення, каб ператварыць гэтую дарогу ва ўчастак першай катэгорыі. Але ўсё, што намі запланавана, будзе зроблена ў тэрмін і, як заўсёды, якасна.

Па бягучым рамонце мы плануем скончыць да 50-га кіламетра дарогу Р-58, Мінск — Мядзел. Працягваем абнаўляць наш парк машын, нам сёлета ўдалося абнавіць частку тэхнікі.

Сёлета ў частцы ўтрымання дарог мы ў ДЭУ-64 пабудавалі сучасны склад солі, падрыхтавалі сучасную базу для яго атрымання, паставілі ўстаноўкі для падрыхтоўкі пясчана-саляных сумесяў. У апошнія гады будаўніцтва мы актыўна робім паслядоўныя крокі па ўзвядзенні будынкаў і тэхналогій, якія дазваляюць утрымліваць аўтамабільную дарогу як у летні, так і ў зімовы перыяд.

— Акрамя таго, — працягнуў Сяргей Сцяпанавіч, — у нас вялікія планы па будаўніцтве і рэканструкцыі дарогі М-7 Мінск — Вільнюс. Зараз мы прапрацоўваем пытанне з Мінтрансам для таго, каб яе мадэрнізаваць, палепшыць пакрыццё і ўладкаваць сучаснымі сродкамі, што забяспечваюць бяспеку руху пры тых хуткасцях, якія плануецца на гэтых дарогах ажыццяўляць.

Што датычыцца планаў на наступны год. Нядаўна адбылася нарада ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень», дзе адным з напрамкаў нашай дзейнасці стала рэканструкцыя дарогі Р-53 да Смалявіч. Праектна-каштарысная дакументацыя ўжо гатовая. Плануем уключыць пад эгідай развіцця індустрыяльнага парка «Вялікі камень» гэты ўчастак дарогі ў вытворчасць.

Натуральна, нашы погляды нацэлены ўжо на 2019 год. У нас у праграме — дарога Р-80 Слабада — Навасады, заканчэнне работ па дарозе Мінск — Гродна і аўтадарога Р-53.

## СКЛАДАНЫЯ І РАЗНАСТАЙНЫЯ ЗАДАЧЫ

Значэнне тэхнічнага ўпраўлення РУП «Мінскаўтадар-цэнтр» цяжка пераацаніць. Яго начальнік, **Алег ВАДЗЯНОВІЧ,** расказвае:

— Задачы ўпраўлення вельмі шырокія. Яны складаюцца з некалькіх кірункаў дзейнасці.

Адзін з самых асноўных — гэта падрыхтоўка праектнай дакументацыі, афармленне адводу зямель для аб'ектаў рэканструкцыі і капітальнага рамонту, праца з праектнымі арганізацыямі ў частцы падрыхтоўкі праектнай дакументацыі. Таксама гэта праца з арганізацыямі па землеўпарадкаванні і праца з выканаўчымі органамі ўлады ў частцы пэўных функцый узгаднення распрацоўкі дакументацыі.

Наступны кірунак, не менш важны, — гэта распараджэнне маёмасцю прадпрыемства: перадача ў арэнду, адчужэнне, прыём на баланс участкаў дарог, будынкаў, збудаванняў, а таксама ўлік усіх гэтых будынкаў і збудаванняў.

— Акрамя гэтага, — кажа Алег Яўгенавіч, — упраўленнем ажыццяўляецца такая функцыя, як баланс уліку аўтамабільных дарог. Штогод намі праводзіцца зверка і інвентарызацыя. У нас акумулюецца ўся патрэбная інфармацыя, мы вядзём дзяржаўны рэестр аўтамабільных дарог: колькі ў нас маецца кіламетраў дарог, якую кожная дарога мае катэгорыю, якое ў яе пакрыццё, колькі на ёй дарожных знакаў, мастоў, пуцеправодаў і г. д. Акрамя таго, у нас ёсць інфармацыя, якую плошчу займае кожная дарога — колькі гектараў.

Ёсць яшчэ ў нас такая функцыя, як узгадненне, размяшчэнне забудовы альбо пракладкі інжынерных камунікацый: газу, водаправода, сувязі, каналізацыі — у прыдарожных палосах аўтамабільных дарог. Натуральна, на нас ляжыць задача разгляду падобных работ, іх узгадненне і выдача тэхнічных умоў.

Ва ўпраўленні працуюць сем чалавек. Усе яны спецыялісты высокага класа. Што і зразумела, паколькі праз іх праходзіць маса разнастайнай дакументацыі і прававых актаў. Дапусцім, калі ўзяць праектаванне — ідзе элемент будаўніцтва, і трэба ведаць усё, што з гэтым звязана, усе адпаведныя заканадаўчыя акты. Калі браць пытанні ўзгаднення — гэта зусім іншы кірунак, са сваімі юрыдычнымі нормамі. Зямельныя пытанні — трэці кірунак. Улік дзяржрэестра, маёмасці — чацвёрты. А ёсць яшчэ і пяты, і шосты... І з усім гэтым трэба спраўляцца — і мы спраўляемся паспяхова.



Аддзел планавання, эканомікі, працы і заработнай платы.
Злева направа: Вядучыя эканамісты — Наталля КАСІРАВА, Вольга КУРЫЛЬЧЫК, Святлана ТРЭЦЦЯКОВА (начальнік аддзела), Ірына БАНЦЭВІЧ.

## ДЫСПЕТЧАРЫ — ВАРТАВЫЯ ДАРОГІ

Дзяжурна-дыспетчарская служба (ДДС) — адно з найважнейшых падраздзяленняў у структуры РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр».

Вось што расказаў аб сваёй службе яе начальнік, **Аляксандр ЗАЙЦАЎ:**

— Асноўная функцыя службы — кантроль за бяспекай і праяздждальнасцю па аўтамабільных дарогах. ДДС працуе ў кругласутачным і круглагадовым рэжыме. Пяцёра дыспетчараў дзяжураць пазменна, па 12 гадзін. Інфармацыя ў дыспетчарскі цэнтр паступае разнастайная.

Акрамя таго, што на дарогах ёсць відэакамеры, якія працуюць у рэжыме рэальнага часу, — кажа Аляксандр Піліпавіч, — ёсць яшчэ праграма «Метэамагістраль». Гэта спецыяльны праграмны прадукт, які мае больш за сотню кантрольна-вымяральных датчыкаў-станцый. Гэтыя датчыкі паказваюць фактычнае надвор'е: хуткасць і інтэнсіўнасць ветру, інтэнсіўнасць ападкаў, выгляд ападкаў, стан пакрыцця. Станцыі працуюць у аўтаматычным рэжыме, і асабліва актуальныя гэтыя станцыі ў зімовы перыяд часу. Яны ажыццяўляюць кантроль за ўтварэннем слізкасці на дарозе. За тры гадзіны да ўтварэння галалёду станцыі выдаюць папярэджанне — мяняюць колер экрана на ружовы. Калі дарожнікі з нейкай прычыны не адрэагавалі, то сістэма за гадзіну да ўтварэння слізкасці падымае трывогу — і тады магчымыя праблемы своечасова прадухіляюцца.



Начальнік дзяжурна-дыспетчарскай службы Аляксандр ЗАЙЦАЎ.



Тэхнічнае ўпраўленне. Злева направа: Юлія ЖУКАВЕЦ, Вікторыя АКУЛІЧ, Вольга ХУЦКАЯ, Настасся ІВАНОВА, Алег ВАДЗЯНОВІЧ (нач. упраўлення), Ірына СМЫКАЛАВА.

Сяргей КУЛАКОЎ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Канстанціна ДРОБАВА.

УНП 190638747

Погляд

# ВАКОЛ АДТЭРМІНОВАК



**У апошні час заўважаю, што тыя або іншыя справы вайсковыя ўсё часцей мусіруюцца ў сродках масавай інфармацыі. Мяне, калі шчыра, больш за ўсё зачапіла пытанне адтэрміновак ад тэрміновай ваеннай службы. Тэма гэтая, вядома, няпростая. І ўсё ж хачу падзяліцца сваім сціплым меркаваннем з гэтай нагоды.**

**Нядаўна Прэзідэнт Беларусі заявіў, што ў нашай краіне каля 80 працэнтаў прызыўнікоў атрымліваюць адтэрміноўкі па тых ці іншых падставах. Гэта ж ашаламляльная лічба! Хтосьці адкладае службу ў арміі «на потым» з-за вучобы, хтосьці — па стане здароўя або па сямейных абставінах. І быццам па законе ўсё, але вось толькі ці заўсёды гэта на карысць самому прызыўніку?**

## «Я НЕ ГОРШЫ ЗА АСТАТНІХ!»

Успамінаю сваю маладосць і сітуацыю, якая склалася асабіста ў мяне. Я нарадзіўся і вырас у беларускай вёсцы. Не ведаю, як цяпер, але ў тыя часы кожны хлопец, які паважаў сябе, імкнуўся адслужыць у арміі. Да таго, хто па нейкай прычыне не прайшоў гэтую школу жыцця, стаўленне было адпаведнае. Даходзіла да таго, што дзяўчаты адмаўлялі такім хлопцам у танцы, ім цяжка было знайсці сабе спадарожніцу жыцця...

У некаторай ступені гэтая праблема закранула і мяне. Трэба сказаць, што ў дзяцінстве я, як і ўсе хлапчукі, гуляў у футбол, нават выступаў на раённых спаборніцтвах за калгас. Аднойчы атрымаў траўму, пасля чаго пачалася праблемы з каленам. І, калі прыйшоў час ісці ў армію, мне далі праслаўтую адтэрміноўку па стане здароўя. Крыўдна было да слёз!

У суседнім доме жыў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, якога ўсе звалі проста, але ў той жа час паважліва: дзед Іванавіч. Будучы дзецьмі, мы часта, раскрыўшы ад здзіўлення раты, слухалі захапляльныя гісторыі франтавіка. А лёс у дзеда быў вельмі цікавы нават на фоне іншых ветэранаў. Малады хлопец апынуўся ў самым пекле вайны, абараняў Сталінград. Іванавіч быў паранены, трапіў у шпіталь і... збег з яго, нават поўнасцю не вылечыўшыся. Змагаўся па-геройску, перамогу сустрэў у вызваленай Польшчы.

Шчыра прызнаюся, калі вярнуўся з ваенкамата з адтэрміноўкай, успомніў гэтую гісторыю, і слёзы міжволі пабеглі з вачэй. Ну як так, чалавек у вайну паранены стаў у строй, а мяне з-за «нейкага калена» ў армію не бяруць!..

Хадзіў да ваенкама штодня, як на працу: «Я не горшы за астатніх! Гатовы выканаць абавязак!» З каленам неўзабаве стала значна лепей. І афіцэр, нарэшце, здаўся.

Служыў я ў радыётэхнічных войсках і сёння ўспамінаю той перыяд з асаблівай цеплынёй. Нездарма армію называюць школай жыцця. Было цяжка фізічна, парой накрывала туга па родным доме... Але ў той жа час менавіта ў арміі я даведаўся, што такое сапраўдная дружба, навучыўся адказваць за свае ўчынкі і прыярытэт стаў аддаваць справам.

## ІСЦІ АД ЖЫЦЦЯ

Вядома, сёння сітуацыя ў некаторай ступені іншая. Аднак, як мне здаецца, пытанне адтэрміновак стаіць усё так жа востра. Напрыклад, вось такая гісторыя разгарнулася літаральна на маіх вачах.

Ёсць у мяне сусед — добры мужык, ды і сына свайго Сашу выхаваў адпаведна. І як бы ўсё ў яго ў жыцці складалася нармальна, але нядаўна ў сям'і на роўным месцы разгарнулася самая сапраўдная драма. Саша ніколі ад арміі не бегаў, але, як той казаў, пусціў гэтую справу на самацёк — маўляў, як атрымаецца, так атрымаецца. Пасля заканчэння школы ён паступіў ва ўніверсітэт, паспяхова яго скончыў, працаваў па спецыяльнасці. Атрымаўшы павестку, не здзівіўся і спакойна пайшоў у ваенкамат. Але падчас праходжання медкамісіі здарылася тое, чаго Сашка ніяк не мог чакаць: у хлопца, які ўсё жыццё лічыў сябе самым здаровым чалавекам на свеце, які не хварэў ні на што сур'ёзнейшае за насмарк, выявілі нейкую хваробу.

Саша нават не ўнікаў у падрабязнасці. Ён нават падумаць не мог, што прызыўнікоў у той раз набяруць дастаткова колькасць і яму ізноў на абсалютна законных падставах дадуць адтэрміноўку. І той раз малады чалавек не стаў займацца высвятленнем прычын таго, што адбылося, кіруючыся прынцыпам: «Ад працы не бегай, на працу не напрошвайся».

Неўзабаве Саша ажаніўся з дзяўчынай, з якой сустракаўся яшчэ падчас вучобы ў ВНУ. У пары нарадзіўся малы. Нядаўна дзіцяці споўнілася тры гады, а яго тату... прызываюць у армію. Сказаць, што Саша знерваваўся, — значыць, нічога не сказаць. Маладой сям'і будзе няпроста перажыць разлуку з карміцелем.

Маму з дзіцем ніхто не кіне — дапамогуць бабулі і дзядулі малога. Але Саша дакарае сябе за тое, што не адслужыў тэрміновую ў 18 гадоў. Ды і пасля вучобы аддаць доўг Радзіме было значна прасцей: абцяжаранняў практычна ніякіх не было. А зараз: жонка, малое дзіця, на рабоце нервуюцца з прычыны таго, што давядзіцца расставацца з каштоўным супрацоўнікам...

І вось пра што кажа сам Саша: «Кожную сітуацыю з адтэрміноўкай трэба разглядаць індывідуальна. Шчыра прызнаюся, калі б можна было адкруціць час назад, я зрабіў бы інакш...»

## А ЯК ЗА МЯЖОЙ?

Адзін мой добры сябар ужо шмат гадоў жыве ў Ізраілі. Дык вось, нядаўна на службу ў армію прызвалі яго... дачку! І гэта для ізраільцян абсалютна нармальная з'ява. Прызываюць на службу ў армію ўсіх грамадзян, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту і якія падыходзяць па стане здароўя. Тэрміновая служба мужчын складае 36 месяцаў, а для жанчын — 24.

Не прызываюцца замужнія жанчыны. Скарыстацца альтэрнатыўнай службай ёсць магчымасць у маладых рэлігійных дзяўчат. Але на практыцы для іх значна больш пажаданы армейскі прызыў. На адтэрміноўку на ўвесь перыяд вучобы можа разлічваць мужчына, які навучаецца ва ўстанове, што адносіцца да ультраартадаксальнага лагера. Адтэрміноўка гэтая ў прынцыпе можа доўжыцца ўсё жыццё. Але нярэдкія выпадкі, калі маладыя ультраартадоксы перарываюць вучобу і ідуць служыць, натхніўшыся духам патрыятызму.

Выпускнік школы, які атрымаў атэстат з выдатнай адзнакай, можа папрасіць у міністэрства абароны дазвол на тое, каб прайсці тэрміновую воінскую службу пасля таго, як будзе атрымана першая або нават другая ступень адукацыі. Аднак потым ён (або яна) абавязаны спачатку прысвяціць тры гады тэрміновай службе, а потым служыць яшчэ чатыры гады пасля таго, як будзе атрымана на афіцэрскае званне!

Ёсць адзін немалаважны нюанс: армію Ізраіля ў большай ступені цікавяць спецыялісты тэхнічных і прыродазнаўча-навуковых профіляў, урачы. Магчыма, гэта камусьці падасца дзіўным і нават няправільным, але факты паказваюць на наступнае: студэнты-гуманітарыі ў Ізраілі наўрад ці могуць разлічваць на атрыманне вышэйшай адукацыі да арміі! Вядома, цалкам праецыраваць сітуацыю ў Ізраілі на беларускія рэаліі было б няправільна. Аднак задумацца ўсім нам ёсць над чым...

Яшчэ больш строгая, на мой погляд, сістэма функцыянуе ў Сінгапуры. Пачынаючы з мінулага года, хлопчыкі разам з пасведчаннем аб нараджэнні атрымліваюць... павестку ў армію! Гэтая ініцыятыва міністэрства абароны распаўсюджваецца толькі на грамадзян краіны.

«Мы хочам загадзя даваць усю неабходную інфармацыю аб абавязковым праходжанні воінскай службы бацькам дзяцей мужчынскага полу», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік мінабароны Сінгапура.

Наступны напамін бацькам патэнцыйнага салдата прыходзіць, калі іх сыну спаўняецца 13 гадоў. Дарэчы, менавіта з гэтага моманту яны абавязаны атрымаць адпаведны дазвол улад, калі раптам захочуць вывезці свайго сына за мяжу на тэрмін ад трох месяцаў і больш, у тым ліку і на вучобу.

Ва ўзросце 16 з паловай гадоў сінгапурскія юнакоў рэгіструюць у сістэме воінскага ўліку. Тады ж яны пачынаюць праходзіць медкамісію, каб пры дасягненні 18-годдзя папоўніць шэрагі ўзброеных сіл Сінгапура...

Пасля заканчэння службы малады чалавек становіцца рэзервістам. Да 40 гадоў ён у абавязковым парадку праходзіць двухтыднёвыя вайсковыя зборы штогод. Трэба сказаць, што ўлады Сінгапура не прызнаюць службу сваіх грамадзян у замежных арміях. Уявіце сабе: калі нават малады чалавек раптам захоча змяніць грамадзянства, то пры адмове ад сінгапурскага ён у любым выпадку павінен паслужыць у арміі краіны!

Спроба ўхіліцца ад службы можа пацягнуць за сабой штраф да 10 тысяч сінгапурскіх долараў (гэта больш за 15,5 тысячы беларускіх рублёў!), турэмнае зняволенне (мінімум два гады!). Потым іх чакаюць прымусовая дастаўка на базу і... тэрміновая ваенная служба.

Цікава тое, што адтэрміноўкі ад прызыву ў армію Сінгапура ўсё ж даюцца. За апошнія дзесяцігоддзе толькі 10 сінгапурцаў атрымалі такое права. Выключэннем стаў плывец Джозэф Скулінг, які быў вызвалены на тры гады для падрыхтоўкі да Алімпіяды-2016. Спартсмен апраўдаў давер і выйграў залаты медаль. Так што служыць у арміі ён будзе ўжо ў статусе алімпійскага чэмпіёна...

**Яраслаў КАГАНСКІ.**


**Извещение о проведении торгов по продаже предприятий как имущественных комплексов, созданных на базе ОАО «Рыбный ряд»**

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | ЧУП «Антикризисная перспектива» (212026, г. Могилев, ул. Сурганова, 6, а/я 29, тел. +375296876609) |
| Продавец | ОАО «Рыбный ряд» (УНП 700067281) |
| Форма, дата, время и место проведения торгов | Первые торги в форме аукциона **04.12.2018 года в 12.00** по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16 |
| Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним | **Лот № 1.** Предприятие как имущественный комплекс с регистр. № 0001323 (ОАО «Рыбный ряд») по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16. **Лот № 2.** Предприятие как имущественный комплекс с регистр. №0001411 (созданном на базе ОАО «Рыбный ряд» (рыбоперерабатывающий цех)). Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по тел.: 80296876609; 8029 3105283 |
| Начальная цена предмета торгов | Лот № 1: 1 626 000,00 бел. руб. без НДС; Лот № 2: 365 000,00 бел. руб. без НДС |
| Порядок проведения торгов | Сумма шага аукциона – 5 % от начальной цены каждого лота. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее более высокую цену за предмет аукциона. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета торгов единственному участнику, подавшему заявку на участие в торгах, либо единственному участнику, явившемуся для участия в них, при его согласии осуществляется по начальной цене, увеличенной на 5 %. Результаты торгов оформляются протоколом, который подписывается комиссией и победителем торгов в день проведения торгов. Договор купли-продажи подписывается в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 5 рабочих дней до наступления даты их проведения |
| Размер, порядок и сроки внесения задатка | Сумма задатка для участия в торгах – 10 % от начальной стоимости каждого лота. Для участия в торгах необходимо в срок с 30.10.2018 до 12.00 03.12.2018 перечислить задаток по предмету торгов по следующим реквизитам: ОАО «Рыбный ряд» 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16, УНП 700067281, р\с BY43BLBB30120700067281001001 в ЦБУ № 831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, БИК BLBBBY2X |
| Место и сроки приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | Место и сроки приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов: Заявления на участие принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 с 30.10.2018 до 12.00 03.12.2018. К заявлению прилагаются: платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юридических лиц – копия свидетельства о госрегистрации, устава; для ИП – заверенная копия свидетельства о госрегистрации; для физических лиц – копия паспорта. Порядок приема заявлений на участие в торгах: Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по адресу: 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, д. 16. Копия направляется на эл. адрес: ruslan.myasoedov.74@mail.ru. Заявления, поступившие после 12.00 3.12.2018, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации. Заявления на участие в аукционе подаются по форме согласно приложению № 3 к приказу Министерства экономики Республики Беларусь от 29.11.2010 №144. Участник аукциона и продавец (организатор торгов) заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по продаже имущественного комплекса (Приложение № 5 к Методическим рекомендациям). Отказ участников аукциона от участия в нем: Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором повторных торгов в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов: возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. В случае отказа или уклонения победителя аукциона от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона результаты аукциона подлежат аннулированию, а внесенный им задаток возврату не подлежит. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов |

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении на ЭТП «ТОРГИБЕЛ» электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего УП «Ремавтодор Фрунзенского района г. Минска»**

**Лот № 161018001.** Автомобиль УАЗ 22069 04 кузов (рама) №22060030213201 / 37410030478705. 2003 г. в. Цвет – белый. Местонахождение: г. Минск, пер. Ольшевского, 7. **Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. – 1 136,15. Задаток, бел. руб. – 115,00. Шаг электронных торгов – 5 %**

**Условия электронных торгов:** 1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 (десяти) календарных дней после утверждения протокола.

2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов в течение 5 (пяти) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

3. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней после утверждения протокола о результатах электронных торгов.

4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов

**Дата и время начала проведения электронных торгов 26.11.2018 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения, утвержденного постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

Продавец: УП «Ремавтодор Фрунзенского района г. Минска», 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 18б, комн. 1, тел./факс 8 (017) 369-68-94.

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 324-70-57.

Электронный адрес ЭТП: http://торги.бел.

Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже имущества, принадлежащего УП «Ремавтодор Фрунзенского района г. Минска» (лот № 1), проводимых 26 ноября 2018 г. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 21.11.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметом. Контактное лицо для осмотра Предметов электронных торгов – Александр Владимирович, тел. 8 (029) 603-10-99. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел.)

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# Узважаныя, змераныя і папярэджаныя!

## Сталічныя медыкі працягваюць прафагляды работнікаў прадпрыемстваў

**Медыкі 11-й гарадской паліклінікі Мінска наведалі сталічны халадакамбінат № 2 у межах акцыі па максімальным ахопе прафілактычнымі аглядамі работнікаў прадпрыемстваў.**

Прадстаўнікі аднаго з найбуйнейшых у краіне вытворцаў марожанага — а ўсяго тут працуе больш за 700 чалавек — маглі здаць аналіз крыві, памераць артэрыяльны ціск, рост і вагу і разлічыць індэкс масы цела. Жанчыны праходзілі таксама агляд і пальпацыю малочных залоз, што важна для своечасовага выяўлення ракавых захворванняў. Акрамя гэтага, усе ахвотныя атрымлівалі кансультацыю ўрача-тэрапеўта і рэкамендацыі па рацыянальным харчаванні, здаровым ладзе жыцця, узроўні неабходнай фізічнай актыўнасці і прафілактыцы неінфекцыйных хвароб.

...**Загадчык аддзялення прафілактыкі 11-й гарадской паліклінікі Ірына ЕЎДАКІМАВА** цікавіцца ў чарговай работніцы, што прыйшла на агляд, якія прэпараты тая прымае пастаянна, і вымярае жанчыне ціск:

— На фоне прыёму гіпатэнзіўных сродкаў ваш ціск не павінен быць вышэйшым за 140 на 90. А ён у вас вышэйшы, — кажа доктар.

Пацыентка пытаецца: напэўна, трэба мяняць прэпараты? Доктар рэкамендуе не спяшацца, а паспрабаваць крыху павялічыць дозу і прапануе іншую схему іх прыёму.

Яшчэ адна пацыентка скардзіцца на кашаль, які не праходзіць працяглы час. Урач выслухоўвае работу лёгкіх і раіць скончыць прыём антыбіётыкаў, а таксама выпісвае рэцэпт на іншыя таблеткі. Тым часам ахвотных трапіць да медыкаў становіцца больш.

— Мы нават не чакалі, што сённяшняя акцыя, якую нам прапанавала 11-я паліклініка, выкліча такую цікавасць, — кажа **намеснік дырэктара УП «Мінскі халадакамбінат № 2» Людміла БОРТНІК.** — Разлічвалі, што будзе каля 50 чалавек, а ў выніку запісалася больш за сотню. Зразумела, для нашых работнікаў гэта вельмі зручна. Не ў кожнага ёсць магчымасць і жаданне пасля працоўнай змены ісці ў паліклініку, а тут можна прайсці агляд за 20 хвілін, знаходзячыся на працы. Паколькі большасць нашых работнікаў — жанчыны, іх у нас больш за 500, то важна, што прыйшлі такія спецыялісты, як фельдшар-акушэр. Акрамя гэтага, усе ахвотныя работнікі могуць зрабіць у нас прышчэпкі ад грыпу. За ўласныя сродкі мы закупілі французскую вакцыну «Ваксігрып», плануем прышчапіць каля 40 % калектыву.

Замест запланаваных трох гадзін акцыя расцягнулася на чатыры з паловай. Затое прынялі ўсіх, хто пажадаў. Асноўныя праблемы, з якімі звярталіся работнікі, — павышаны артэрыяльны ціск і іншыя сардэчна-сасудзістыя захворванні.

**Паводле інфармацыі Гарадскога цэнтра здароўя, у Беларусі захоўваецца значная розніца ў працягласці жыцця мужчын і жанчын, якая на працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў складае 10 і больш гадоў. Сярод прычын, якія ўплываюць на такі разрыў, — паводзінскія фактары рызыкі: курэнне, высокі ўзровень ужывання алкаголю, нездаровае харчаванне і недастатковая фізічная актыўнасць. Комплекснае ўздзеянне гэтых фактараў павышае рызыку развіцця неінфекцыйных хвароб, у тым ліку сардэчна-сасудзістых (напрыклад, інфаркту і інсульту), раку, хранічных рэспіраторных хвароб (такіх, як хранічная абструктыўная хвароба лёгкіх і астма), цукровага дыябету.**

— Мы не толькі далі работнікам, якія звярнуліся, кансультацыі па іх захворваннях, далейшым абследаванні і лячэнні, але і расказалі пра неабходнасць ранняга выяўлення сардэчна-сасудзістых хвароб, раздалі памяткі і лістоўкі па тэматыцы здаровага ладу жыцця, рацыянальным харчаванні і прафілактыцы неінфекцыйных хвароб, — падвяла вынік акцыі Ірына Еўдакімава.

Скажыце, доктар!

# СКАВАНЫЯ БОЛЕМ

**На рэўматоідны артрыт ва ўсім свеце пакутуе каля 1 % насельніцтва, і наша краіна — не выключэнне. З аднаго боку, большасць хворых добра ведае, як важна трымаць артрыт пад кантролем. А з другога — многія не ўсведамляюць элементарных рэчаў. Напрыклад, што пашкоджанні суставаў — з'явы незваротныя. Некаторыя памылкова мяркуюць, што адсутнасць болю і ёсць кантроль над хваробай. У той жа час тут важна своечасова паставіць дыягназ і як мага хутчэй пачаць лячэнне. Якія сімптомы павінны насцярожыць і прымусіць звярнуцца да ўрача, што павышае рызыку гэтай хваробы, а якія фактары яе, наадварот, мінімізуюць, расказала ўрач-рэўматолаг 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Мінска Іна БАШТАВАЯ.**



— Рэўматоідны артрыт — гэта хранічная аўтаімунная сістэмная запаленчая хвароба злучальнай тканкі з пераважным пашкоджаннем суставаў. Адбываецца своеасаблівая паломка ў імунітэце, і лімфацыты — клеткі-абаронцы нашага арганізма — замест таго, каб актыўна дыягнаставаць чужародныя бактэрыі, вірусы, грыбы і ліквідаваць іх, пачынаюць атакаваць і знішчаць уласныя здаровыя клеткі. З-за гэтага, папросту кажучы, з'яўляецца запалены працэс у суставах. Рэўматоідны артрыт сустракаецца ў 0,1-1 % насельніцтва, і ва ўсім свеце такіх хворых каля 58 мільёнаў. Гэта дастаткова распаўсюджаная хвароба. Прычым жанчыны на яе пакутуюць у 2-3 разы часцей за мужчын. Пік хваробы прыходзіцца на працаздольны актыўны ўзрост — 30—55 гадоў.

**— Па якіх прычынах яна ўзнікае?**

— Гэта дакладна не высветлена. Праўда, вылучана некалькі фактараў, якія спрыяюць развіццю хваробы. Па-першае, генетычныя. У хворых устаноўлена спадчынная схільнасць да парушэнняў імуналагічнай рэактыўнасці. Таму калі кроўныя сваякі хварэюць на рэўматоідны артрыт, рызыка яго ўзнікнення павялічваецца ў 16 разоў.

**Па-другое, выяўлена некалькі інфекцыйных агентаў, якія з'яўляюцца пускавым механізмам для развіцця захворвання. Найперш гэта вірус Эпштэйна — Бар — даследчыкі адводзяць яму вялікую ролю, а таксама вірусы краснухі, герпесу, мікаплазмы, кішэчныя бактэрыі.**

Дарэчы, кампаненты тытуню могуць спрыяць развіццю хваробы, таму курыльшчыкі таксама рызыкуюць. Па-трэцяе, вялікае значэнне маюць гарманальныя фактары. У жанчын, якія кормяць дзіця грудзямі на працягу 24 месяцаў, імавернасць захварэць у некалькі разоў змяншаецца, а ў тых, хто не корміць, адпаведна рызыка павялічваецца. Гэтак жа прыём кантрацэптываў павышае рызыку развіцця рэўматоіднага артрыту, а цяжарнасць яе зніжае.

**— Як сябе праяўляе хвароба?**

— Не заўважыць яе нельга, бо суставы ў нас заўсёды задзейнічаны. Найбольш характэрнай праявай з'яўляецца поліартрыт — запаленне адразу некалькіх суставаў. Як правіла, гэта сіметрычны артрыт: калі на адной руцэ пашкоджаны сустаў, то і на другой, як правіла, таксама. Часцей за ўсё пакутуюць суставы кісцяў, ступняў, каленяў і праменезапясцевыя, пазванковыя — радзей. Адчуваюцца балючасць пры пальпацыі, прыпухласць, скаванасць рухаў, павышэнне тэмпературы скуры над суставам. Вельмі важны сімптом — скаванасць сустава на працягу гадзіны пасля сну. Пацыенты адзначаюць тугагнуткасць, яны не могуць сябе абслугоўваць. Немагчыма выканаць банальныя дзеянні — адрэзаць хлеб, трымаць кубак, пачысціць зубы. Патрабуецца каля гадзіны, каб распрацаваць суставы.

**— Як дыягнаставаць гэта захворванне? Яно можа маскіравацца пад іншыя сустаўныя хваробы?**

— Калі пацыент упершыню звярнуў увагу на названыя праявы, на тое, што нейкі з суставаў прыпух, варта хутка звярнуцца да ўрача, які прызначыць неабходныя абследаванні: рэнтгенаграфію, біяхімічны аналіз крыві, у якім вызначаюць такія паказчыкі, як рэўмафактар і С-рэактыўны бялок. Існуе і спецыфічны метад лабараторнай дыягностыкі, аналіз крыві на аўтаімунныя антыцелы, або так званы анты-ССР, гэта маркер рэўматоіднага артрыту, яго дакладнасць — 90 %. Рэўматоідны артрыт трэба адрозніваць ад артрозу, на які хварэюць людзі сталага ўзросту (там таксама разбураецца сустаў). З артрозам не бывае такіх характэрных прыкмет, як змяненне колеру скуры і павышэнне тэмпературы сустава. Многія хворыя робяць памылку: доўгі час не звяртаюць увагу на тое, што адбываецца з суставамі, лічачы гэта ўзроставымі зменамі. А трэба адразу ісці да доктара.

**— Рэўматоідны артрыт — спадарожнік да канца жыцця?**

— Гэта захворванне хранічнае, і яно, на жаль, не вылечваецца. Пацыенты павінны пажыццёва прымаць тэрапію. Сучасныя метады накіраваны на змяншэнне запалення, абязбольванне, паляпшэнне і захаванне функцыі суставаў і папярэджанне інваліднасці. Хворыя ставяцца на дыспансерны ўлік, павінны перыядычна наведваць рэўматолага, які кантралюе паказчыкі аналізаў, каб гэта дастаткова агрэсіўная тэрапія не аказала пабочнага ўплыву. Але прыём прэпаратаў дазваляе пацыентам весці нармальнае актыўнае жыццё. Ад пачатку захворвання да пастаноўкі дыягназу праходзіць, як правіла, каля дзевяці месяцаў. Бо нярэдка ёсць клінічныя праяўленні, але пры гэтым лабараторныя паказчыкі ў норме. Ці, наадварот, аналізы дадатныя, а на суставы пацыент не скардзіцца. У такім выпадку няма паказанняў прызначаць тэрапію.

**— Чым небяспечны рэўматоідны артрыт, калі яго не лячыць ці лячыць няправільна?**

— Гэта дастаткова сур'ёзнае захворванне, якое прыводзіць да інваліднасці. Калі не прымаць мер, усё скончыцца разбурэннем сустава. У хворых, якія не лечацца, суставы моцна дэфармуюцца, яны перастаюць сябе абслугоўваць. Пацыенты, дарэчы, атрымліваюць бясплатнае лячэнне па льготных рэцэптах. Базісныя прэпараты, якія яны павінны прымаць, тармозяць прагрэсаванне дэструкцыі суставаў. Лекавыя сродкі і дозу рэўматолаг падбірае індывідуальна. Таксама пацыенты прымаюць нестэроідныя супрацьзапаленчыя абязбольвальныя прэпараты, каб скаванасць у суставах была меншай, не турбаваў боль.

**— Восень — час абвастрэння хранічных хвароб. Рэўматоіднага артрыту гэта датычыцца?**

— Так, абвастрэнні, як правіла, здараюцца ў асенне-веснавыя перыяды. Могуць уплываць і знешнія фактары: пераахалоджванні, стрэсы, вірусныя інфекцыі. Таму такія пацыенты ўваходзяць у групу рызыкі і ў абавязковым парадку павінны прышчапляцца ад грыпу ў перыяд рэмісіі рэўматоіднага артрыту. Паколькі базісныя прэпараты — гэта імунасупрэсіўная тэрапія, яна прыгнятае імунітэт, усе вірусныя інфекцыі ў такіх хворых працякаюць больш цяжка. Таму варта адразу саніраваць усе ачагі інфекцыі: вылечваць дэрматалагічныя, уралагічныя, лор-хваробы. Яны ўзмацняюць прагрэсаванне артрыту.

**— Што можна рабіць, каб пазбегнуць хваробы?**

— Спосабаў прафілактыкі няма, бо, як я казала, дакладных прычын узнікнення не выяўлена. Агульная рэкамендацыя для ўсіх пацыентаў — пазбягаць стрэсу. Часта назіраю ў сваёй практыцы, што менавіта пасля перанесенага стрэсу з'яўляюцца такія хранічныя хваробы. Спрыяюць пераахалоджванне, сур'ёзныя вірусныя інфекцыі.

**— Што рабіць, каб жыццё з рэўматоідным артрытам было камфортным?**

— Акрамя прыёму прэпаратаў, патрэбна фізічная актыўнасць, накіраваная на максімальную рухавасць суставаў і захаванне цягліцавага тонусу. Суставы трэба распрацоўваць, бо ў адваротным выпадку з'явяцца кантрактуры. Патрэбна дыета, багатая на кальцый, абавязкова ўжываць малочныя прадукты. Калі няма абвастрэння, карысная і фізіятэрапія.

Разам

# «КАРАНІ ТРАВЫ», ЯКІЯ ДАПАМАГАЮЦЬ

## Кіраўніцтва Японіі вылучыла больш за 200 тысяч долараў для бальніц на Гомельшчыне і Брэстчыне

**Дзякуючы гэтаму Брэсцкая абласная дзіцячая бальніца зможа закупіць артраскоп (разнавіднасць эндаскопа, які дазваляе выконваць хірургічныя маніпуляцыі на суставах) і эндаскоп на суму 79 272 долары. Хойніцкая цэнтральная раённая бальніца атрымае грант на суму 60 450 долараў на закупку бронхаскопа і каланаскопа. Калінкавіцкая цэнтральная раённая бальніца зможа набыць гастраскоп на суму 76 350 долараў. Агульная сума выдзеленых сродкаў складзе 216 072 долары.**

З 2004 года пасольства Японіі ў Беларусі рэалізуе праграму кіраўніцтва Японіі «Карані травы — грантавая дапамога для праектаў па гарантаванні бяспекі чалавека». У яе межах вылучаюцца сродкі з мэтай дапамагчы людзям, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і яе наступстваў. Грантавая дапамога прадугледжвае выдзяленне сродкаў для закупкі абсталявання, а таксама аснашчэнне медыцынскіх устаноў. У нашай краіне за гэты час ужо рэалізавана 42 такія праекты на агульную суму больш за 3,5 мільёна долараў. Гэта дапамагло ўдасканаліць медыцынскае абсталяванне ва ўстановах аховы здароўя, якія аказваюць дапамогу людзям, пацярпелым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Сёлетнія праекты стануць 43-м, 44-м і 45-м рэалізаванымі ў рамках праграмы «Карані травы».

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

## Іна АФАНАСЬЕВА:

# «50 ГАДОЎ — УСЕ МАЕ, І ЯНЫ МНЕ ПАДАБАЮЦЦА!»



**Шчаслівыя людзі рэдка пахваляюцца на ўвесь свет сваімі пачуццямі. Мабыць, таму спявачка Іна Афанасьева, якая некалькі гадоў назад выйшла замуж за пецярбургскага бізнесмена Аляксандра Котава, не выносіць асабістыя эмоцыі на публіку, не вельмі часта з'яўляецца ў тэлеэфіры і на свецкіх тусоўках. Але сёлета выпадак асаблівы: у артысткі ёсць важкія нагоды, каб адкрыта пагаварыць і нават прызнацца ў любові — да блізкіх, да слухачоў, да музыкі і сцэны. 28 кастрычніка заслужаная артыстка Беларусі адзначае круглую дату — 50 гадоў, а 2 лістапада запрашае сяброў і прыхільнікаў на вялікі сольны канцэрт «Любоў мая...», прысвечаны таксама 30-годдзю творчай дзейнасці. Пра любімыя песні і добрыя ўспаміны, дарагіх людзей і планы на будучыню «Звязда» распытала Іну Афанасьеву напярэдадні асабістага і творчага юбілею.**

**— У адным з нядаўніх інтэрв'ю вы сказалі, што юбілейны канцэрт будзе апошнім. Гэта канчатковае рашэнне? Цяжка паверыць, што такая энергічная жанчына, папулярная спявачка раптам сядзе дома і будзе проста жонкай свайго мужа...**

— Не ведаю, як далей складуцца абставіны, але пакуль гэта сапраўды так. Не хацела б зараз каментаваць, чаму і што адбываецца, занадта сумная і глыбокая тэма, але мяркую, што на дадзеным этапе так будзе правільна.

**— Публіка прызвычаілася, што вашы сольныя канцэрты — гэта заўжды яскравае і яркае шоу. Што ўбачаць гледачы 2 лістапада і каго з калег, сяброў чакаеце ў госці?**

— Так, сапраўды рыхтуем шоу, літаральна завяршаем апошнія зводныя рэпетыцыі, каб расставіць патрэбныя акцэнты. На мой погляд, праграма атрымалася прыгожая, з цікавай сцэнаграфіяй, з сюрпрызамі для гледачоў. І хоць на канцэрце самае галоўнае — настрой, а не тое, у што ты яго абгорнеш, але я разумею, што публіка чакае шоу, таму захоўваю гэту традыцыю. Звычайна ў сольных праграмах я працую адна, але тут асаблівая нагода, і хацелася прыгадаць розныя этапы майго шляху, некаторыя асабістыя падзеі і запрасіць на сцэну таксама калег, з якімі мы ўжо 30 гадоў працуем разам і сябруем не толькі на сцэне, але і за кулісамі. Таму ў канцэрце выступяць і Ірына Дарафеева, і Аляксей Хлястоў, і гурт «Аўра», з якімі мы шмат гадоў знаходзімся на адной хвалі і добра разумеем адно аднаго: Юля Быкава і Жэня Алейнік напісалі для мяне мноства добрых песень, і, дарэчы, Жэня адказвае за музычную частку гэтага канцэрта. Ніякіх замежных выканаўцаў у праграме не будзе — хочацца выступіць сваімі сіламі і «для сваіх». А вось геаграфія слухачоў, наколькі я ведаю, вельмі шырокая: на канцэрт збіраюцца мае прыхільнікі з розных гарадоў і краін, у тым ліку з далёкага замежжа.

**— Пару гадоў таму ў айчынным тэлепраекце «Дзве зоркі» вы прыемна ўразілі прыхільнікаў дуэтам з сынам Іванам — магчыма, гэты творчы праект атрымае працяг?**

— Ваня ў мяне проста вельмі сціплы таварыш, і я ледзьве ўгаварыла яго на ўдзел у тым тэлепраекце. Нават выступіць на юбілейным канцэрце пераканала, але, на жаль, ён вельмі шчыльна заняты ў тэатры (Іван Стральцоў — акцёр, служыць у Рускім тэатры. — **Аўт.**), і там такі напружаны графік, што ў многіх спектаклях няма кім яго замяніць... Мы абое засмуціліся з гэтай нагоды, але што тут зробіш — працу часам немагчыма адкласці.

Думаю, з часам Іван прыйдзе да разумення таго, што я не проста артыстка, спявачка, а перадусім яго мама, і бацькі на тое і існуюць, каб падтрымліваць сваіх дзяцей, дапамагаць і спрыяць ім, наколькі гэта магчыма. Асабіста я буду вельмі ўсцешана, калі ён працягне выступаць не толькі як акцёр, але і як выканаўца, тым больш у яго гэта добра атрымліваецца, Іван вельмі музыкальны, у яго цудоўны тэмбр голасу, не стае хіба трохі ўпэўненасці ў сабе.

**— Ваша маленькая ўнучка Варвара — музыкальнае дзяўчо? Калі яна захоча выйсці на сцэну, будзеце падтрымліваць ці адгаворваць?**

— О, яна вельмі музыкальная, у яе ўжо свае мікрафоны, яна танцуе і спявае бясконца мае песні — «Першы снег», «Карункі», «Сарамлівая дзяўчынка», наогул ведае словы вельмі многіх песень з рэпертуару. У гэтым сэнсе яна проста цудоўная, і мы ўсе вельмі радуемся кожнаму новаму слову і новаму кроку Вары. Сёлета яна пайшла ў мадэльнае агенцтва — я лічу, для дзяўчынкі ўсе гэтыя рэчы карысныя. Што да заняткаў вакалам і харэаграфіяй, то мы не вельмі супадаем па графіках, дый Вара яшчэ маленькая, каб яе моцна нагружаць, — ёй жа толькі тры гадкі. Аднак у далейшым, калі захоча сябе паспрабаваць, я буду толькі за. Ведаеце, я і Ваню заўжды казала, што калі б не бачыла ў ім здольнасцяў, а толькі пасрэднасць, то і не прапаноўвала б займацца спевамі. Так і ў гэтым выпадку: калі ў Вары праявяцца талент і жаданне, то чаму не? Канешне, хочацца ўсё перадаць, растлумачыць, расказаць пэўныя сакрэты прафесійнай сцэны — бо хоць гэта і зусім іншае пакаленне, але класіку, не пабаюся гэтага слова, ніхто не адмяняў.

**— Мяркуючы па тым, з якой цеплынёй вы гаворыце пра ўнучку, вы хутчэй клапатлівая бабуля, чым строгая (хоць з вамі і наогул не вяжацца слова «бабуля»)...**

— Не магу сказаць, што сляпа дазваляю рабіць усё, што ўнучка пажадае, — у нас ёсць пэўныя забароны і абмежаванні. Але гэта ніколі не забарона дзеля забароны: кожнае «не» мы тлумачым, стараемся, каб Вара расла і выхаванай, і развітой дзяўчынкай, якая ўмее мысліць. Асабіста я пераканана, што ўсяго можна дасягнуць не шляхам пакарання, а з дапамогай любові, пра якую многія часта забываюцца.

**— Вы ўжо некалькі гадоў жывяце на дзве краіны. Дзе сёння пачуваецеся больш камфортна, дзе больш улюбёных месцаў: у Санкт-Пецярбургу, Мінску, родным Магілёве?**

— А ведаеце, я не магу сказаць, што пакінула сваю душу ў адным канкрэтным месцы, кожны з гэтых гарадоў па-свойму любімы. Заўжды з задавальненнем прыязджаю ў Магілёў: ён цяпер істотна вырас, і кожны раз, праязджаючы па гарадскіх вуліцах, бачыш, якія з'явіліся новабудоўлі, што адрэстаўравана, што цалкам памянялася... Таксама вельмі сумую па Мінску, гэта непаўторна прыгожы горад, у якім я адчуваю сябе дома, цалкам у бяспецы — і нідзе, ні ў адной краіне свету дакладна не буду сябе так адчуваць. У Піцеры я люблю гуляць па вуліцах і асабліва па Неўскім праспекце, глядзець на архітэктуру, даведвацца цікавыя гісторыі пра горад, хадзіць у музеі — абажаю Эрмітаж і магу днямі хадзіць па яго залах, кожны раз знаходзячы нешта новае. Мы з мужам, ён таксама вельмі лёгкі на пад'ём, аб'ездзілі ўжо практычна ўсё наваколле Пецярбурга ў пошуках розных цікавінак. У кожным з гэтых гарадоў — свая прыгажосць і свая атмасфера.



**— Ведаю, што гэты год юбілейны і для вас, і для вашага мужа Аляксандра, нават планавалася зладзіць адно сумеснае вялікае свята. Ці ўдалося?**

— Я прапаноўвала гэта зрабіць, але муж чамусьці засаромеўся і адмовіўся. Ягоны юбілей мы адзначалі, можа быць, не так гучна, як мой, — але ж галоўнае, не якую колькасць людзей ты запрасіў на дзень нараджэння, а хто побач з табой, і ў гэтым сэнсе ўсё атрымалася выдатна: прысутнічалі сапраўды дарагія, блізкія людзі. Але і мой юбілей — таксама ягонае свята, бо ўсё гэта не адбылося б без яго ўдзелу і заўсёднай падтрымкі. Гэта, напэўна, якраз той самы выпадак, калі разам можна пайсці ў разведку.

**— Паралельна са сцэнічнай кар'ерай многія артысты ідуць у бізнес: хто выпускае лінію адзення або касметыкі, хто адкрывае прадзюсарскія цэнтры, хто трымае кавярні... У вас, помню, таксама быў цікавы вопыт — выпуск эксклюзіўнай парфумы, за якой нават ганяліся сталічныя моднікі. Чаму потым адмовіліся ад гэтай ідэі?**

— Тады быў 2008 год, ужо наступаў сусветны эканамічны крызіс. І як чалавек, што ўкладвае практычна ўсё заробленае ў творчасць, я проста рэальна ацэньвала свае сілы і разумела, што складана будзе ператварыць задумку ў больш-менш сур'ёзны бізнес. Хоць сам эксперымент быў цікавы, і першая партыя парфумы добра разышлася, а пазней, дарэчы, многія артысты пачалі таксама выпускаць імянныя водары, так што я стала ў пэўным сэнсе першапраходцам, гэта прыемна. *(Смяецца.)*

Наогул, я зусім не бізнесмен. Хоць у будучыні, прызнацца, хачу адкрыць шоўрум. Бо ў мяне за шмат гадоў назбіралася неверагодная колькасць убораў, сукенак — гэта насамрэч праблема, ва ўсіх дамах шафы ўжо не ўмяшчаюць столькі адзення! Мяркую, многія жанчыны з задавальненнем узялі б напракат убор, які, магчыма, спатрэбіцца раз у жыцці.

**— Акрамя рэчыўнага, у вас назапасіўся і немалы творчы багаж: больш як 200 песень на розных мовах. Ці ёсць сярод іх тыя, якія вы пяшчотна любіце, нягледзячы на «тэрмін даўнасці»?**

— Іх нямала. Бывае, нейкую песню не выконваеш гадоў дзесяць, як было ў мяне з «Жамчугамі», а потым зноў да яе вяртаешся. Канешне, падабаецца кожная новая песня, але з цягам часу яна адыходзіць на другі план, у засекі памяці, і праз нейкі час разумееш песню інакш і выконваеш яе ўжо з іншымі пачуццямі. Дарэчы, у юбілейным канцэрце якраз будзе шэраг песень, якія я не спявала ўжо вельмі даўно, але хацела б да іх вярнуцца. Але будзе таксама і некалькі прэм'ер, якія, спадзяюся, прыйдуцца даспадобы гледачам. Яшчэ плануем выпусціць да юбілею дзевяць дыскаў: перавыдаць усе альбомы, што былі запісаны раней, а таксама прадставіць новы.

**— За 30 гадоў на прафесійнай сцэне складана падлічыць усе ўзнагароды, тытулы і дыпломы, якія вы атрымлівалі, ад II прэміі «Славянскага базару ў Віцебску» да перамогі на Нацыянальнай музычнай прэміі «Ліра». Для вас якая з гэтых узнагарод асабліва дарагая?**

— Кожная ўзнагарода каштоўная як ацэнка тваёй працы. Хоць я заўжды баялася надта ўжо радавацца перамогам, мне ўсё здавалася, што бог пакарае за празмерны гонар, таму старалася ўспрымаць поспех спакойна. А самая важная ўзнагарода для мяне — натуральна, званне заслужанай артысткі краіны, у якой я жыву, спяваю і працую. Бо гэта, як бы пафасна тое ні гучала, дазваляе адчуць сябе часткай Радзімы, сваёй культуры — і я вельмі цаню, ганаруся і заўжды помню пра гэту ўзнагароду. І колькі б артысты ні казалі, што ім усё адно, ці ёсць званні, ці іх няма, але ўсе імкнуцца быць заўважанымі, атрымаць прызнанне.

**— Нават строгія крытыкі прызнаюць, што вы з узростам толькі прыгажэеце і квітнееце. Таму ў вас часта пытаюцца пра вонкавую і ўнутраную прыгажосць, а вы паўтараеце, што ўсё іграе ролю — і генетыка, і здаровы лад жыцця, і догляд сябе, — але галоўнае — жыць у гармоніі з сабой. Але ж гэта самае складанае! Як удаецца захоўваць гэты лад?**

— Перш за ўсё трэба пазбавіцца ад самых страшных заган у жыцці — я пераканана, што гэта зайздрасць, зласлівасць і ўпэўненасць у тым, што вам заўжды нехта вінен. Калі не займацца самаўдасканаленнем і ставіць сябе вышэй за ўсіх іншых людзей, то колькі б вы ні рабілі пластычных аперацый і «ўколаў прыгажосці», колькі б ні займаліся зарадкай, але ў вашых вачах усё адно будзе адлюстроўвацца ўнутраная злая і непрыгожая сутнасць. А вось калі ўдасца сябе перавыхаваць, прагнаць гэтых дэманаў, то вы навучыцеся радавацца поспехам іншых людзей і, не робячы бліжняму брыдоты, самі станеце значна лепшым і прыгажэйшым чалавекам — і вонкава, і ўнутрана. Гэта абсалютна дакладна, я ведаю.

Ужо даўно не імкнуся нікому нічога даказваць, навязваць або тлумачыць. Я не імкнуся выглядаць на 20 або 30 гадоў — усе мае 50 гадоў — мае, і яны мне падабаюцца! А як мяне ўспрымаюць навакольныя — гэта ўжо іх праблема. Нядаўна патэлефанавала мая мама, якой прыяцелька расказала ўражанні ад канцэрта ў Магілёве: «Усе пляткараць, што Афанасьева, канешне, зрабіла пластычную аперацыю, а я на іх сваруся, навошта гаварыць тое, пра што не ведаюць». «Мама, — кажу, — а не трэба нічога даводзіць. Што б ні сказаў публічны чалавек, усё адно гэта будуць абмяркоўваць і перадаваць у падрабязнасцях, што і куды я ўкалола».

**— Помніце, у фільме «Масква слязам не верыць» гераіня казала, што ў 40 гадоў жыццё толькі пачынаецца. А ў 50?**

— Мне здаецца, 50 — выдатны ўзрост, бо прыходзіць і пэўная мудрасць, і другая — ці ўжо трэцяя? — маладосць. *(Смяецца.)* Цудоўны ўзрост для таго, каб прыгадаць усё добрае, што было ў жыцці, і ўзяць самае добрае і каштоўнае ў далейшае жыццё. Гэта новы этап, у якім самае цікавае — што цябе чакае далей, у наступныя 50 гадоў. У нас з мужам вельмі многа планаў, шмат дзе хочацца пабываць, шмат што ўбачыць. Хочацца назіраць, як растуць унукі, і паглядзець, кім яны стануць, жыць з новымі спадзяваннямі і ісці да новых здзяйсненняў.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ГЕРТ і з асабістага архіва артысткі.**





# «ЯК САМА ЦАРЫЦА!..»







Пра сёлетнюю восень — аксамітную, надзіва цёплую і прыгожую — залатую! — так і хочацца сказаць словамі нашага песняра Янкі Купалы: «Як сама царыца ў залатой кароне...» Даўно прырода не пеставала нас такой шчодрай на фарбы і сонца восенню. Кожны кастрычнік я выпраўляюся на своеасаблівыя агледзіны не толькі ў навакольныя скверы, але і ў вядомыя ў сталіцы і краіне паркі: Лошыцкі і парк Радзівілаў у Нясвіжы. Вось і сёння яны зноў мяне паклікалі пад свае залатыя шаты, прымусілі блукаць па старажытных шапаткіх алеях, удыхаць гаркавы водар лістоты. А яшчэ ўслухоўвацца ў вясёлыя галасы людзей, здымаць усмешкі на іх шчаслівых тварах, заглядацца на залатыя вяночкі на дзіцячых і дзявочых галоўках. Сёлетняя восень шчодра папоўніла маю калекцыю новымі здымкамі царыц у залатых каронах.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**





*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (продавец). Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Ангарская, 17

| № Лота | Описание | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Вознаграждение, % от цены продажи |
|---|---|---|---|---|
| № 21 | Пресс листогибочный гидравлический ИП 1424. Зав. № 194. 2009 г. в. Инв. № КТ50000254 | 7 992,00 | 639,36 | 8 |
| № 22 | Пресс листогибочный И 1020. Зав. № 110. 1990 г. в. Инв. № КТ00021090 | 2 376,00 | 356,40 | 15 |
| № 23 | Пресс листогибочный И1020А. 2007 г. в. Инв. № КТ50000258 | 3 456,00 | 518,40 | 15 |
| № 24 | Пресс листогибочный И1020А. Инв. № КТ50000259 | 3 456,00 | 518,40 | 15 |
| № 25 | Пресс листогибочный И1330. Зав. № 1371. 1976 г. в. Инв. № КТ00020930 | 5 400,00 | 540,00 | 10 |
| № 26 | Пресс листогибочный с матрицей И1020А. Зав. № 50. 2008 г. в. Инв. № КТ50000235 | 3 456,00 | 518,40 | 15 |
| № 27 | Пресс-ножницы НВ 5222Б. Зав. № 2446. Инв. № КТ00021067 | 3 888,00 | 583,20 | 15 |
| № 28 | 1. Прилавок раздаточный SXEC 926x422x660. Инв. № КТ50000330. 2. Прилавок раздаточный SXED 1071x422x660. Инв. № КТ50000328. 3. Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850. Инв. № КТ50000331. 4. Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850. Инв. № КТ50000332. 5. Транспортная дорожка для подносов SXDR 4770x307x30. Инв. № КТ50000333. 6. Шпилька КШ-3 (для столовых подносов). Инв. № КТ50000334. 7. Шпилька КШ-3 (для столовых подносов). Инв. № КТ50000335 | 2 639,00 | 395,85 | 15 |
| № 29 | 1. Пылеулавливающий агрегат УВП-2000А. Инв. № КТ50000180. 2. Станок вертик.-фрезер. 65А80МФ4. Инв. № КТ00021260 | 29 420,00 | 882,60 | 3 |
| № 30 | Установка зачистная Rotofera F DIN10 110020. Инв. № КТ50000359 | 497,00 | 99,40 | 20 |
| № 31 | Станок FINN-POWER. Инв. № КТ50000339 | 251 640,00 | 7 549,20 | 3 |
| № 32 | Станок вертик.-сверлильн. 2С132. Инв. № КТ00020941 | 1 512,00 | 302,40 | 20 |
| № 33 | Станок вертик.-сверлильн. 2н135. Инв. № КТ00020885 | 1 188,00 | 237,60 | 20 |
| № 34 | Станок вертик.-сверлильн. 2С132. Инв. № КТ00020401 | 1 512,00 | 302,40 | 20 |
| № 35 | Станок внутришлифовальный 3к-2281А. Инв. № КТ00020133 | 9 072,00 | 453,60 | 5 |
| № 36 | Станок консольно-фрезерный 6т12-1. Инв. № КТ00020541 | 2 916,00 | 437,40 | 15 |
| № 37 | Станок консольно-фрезерный 6т82-Г. Инв. № КТ00020176 | 2 592,00 | 388,80 | 15 |
| № 38 | Станок консольно-фрезерный 6т-12. Инв. № КТ00020559 | 2 016,00 | 403,20 | 20 |
| № 39 | Станок копировально-фрезерный 6Г463. Инв. № КТ00020605 | 1 512,00 | 302,40 | 20 |
| № 40 | Станок корд-расточной 2Е-450АФ1. Инв. № КТ00020265 | 9 180,00 | 459,00 | 5 |
| № 41 | Станок лазерной резки LaserCUT-4015-3-1.5-S-RT (в компл). Инв. № КТ50000343 | 206 280,00 | 2 062,80 | 1 |

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 5(пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу затраты по оплате вознаграждения Организатору аукциона посредством заключения соглашения о возложении обязанности между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 28.11.2018 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи», проводимом 28 ноября 2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 26.11.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (продавец). Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Ангарская, 17

| № Лота | Описание | Начальная цена, с НДС, бел.руб. | Задаток, бел. руб. | Вознаграждение, % от цены продажи |
|---|---|---|---|---|
| № 42 | Станок ленточнопильный мод. ARG 240 Plus. Инв. № КТ49305 | 2 484,00 | 372,60 | 15 |
| № 43 | Станок прод.-фрез. 6М612МФ4. Инв. № КТ00020826 | 179 280,00 | 1 792,80 | 1 |
| № 44 | Станок профильно-шлиф. ОШ224Н2. Инв. № КТ00020310 | 3 348,00 | 502,20 | 15 |
| № 45 | Станок радиально-сверлил. 2А5542. Инв. № КТ00020923 | 3 780,00 | 567,00 | 15 |
| № 46 | 1. Станок расточной модели 2206ВМФ без ЧПУ и электроприводов (мехбаза к станку инв. № 20966). Инв. № КТ1520344. 2. Станок свер.-фр.-раст. с ЧПУ 2206ВМФ4 без мехбазы (м/б №1520344). Инв. № КТ00020966 | 13 608,00 | 680,40 | 5 |
| № 47 | Станок токарно-винторезный мод. 1М63Н3. Инв. № КТ5114 | 11 772,00 | 588,60 | 5 |
| № 48 | Станок токарно-винторезный мод. 16ВТ20П-22. Инв. № КТ55004 | 19 224,00 | 576,72 | 3 |
| № 49 | Станок токарно-винторезный мод. 16ВТ20П-22. Инв. № КТ55002 | 19 224,00 | 576,72 | 3 |
| № 50 | Станок точил.-шлифовой 3к-634. Инв. № КТ00020303 | 1 188,00 | 237,60 | 20 |
| № 51 | Станок точил.-шлифовой 3к-634. Инв. № КТ00020280 | 1 188,00 | 237,60 | 20 |
| № 52 | Станок унив.-заточ. 3В642. Инв. № КТ00020362 | 1 944,00 | 388,80 | 20 |
| № 53 | 1. Стол раздаточный SXN 1000x700x900. Инв. № КТ50000336. 2. Стол раздаточный SXN 1000x700x900. Инв. № КТ50000337. 3. Стол раздаточный SXN 1100x700x900 мм. Инв. № КТ50000327 | 2 562,00 | 384,30 | 15 |
| № 54 | Токарно-винторезный станок мод. 16ВТ20П-21. Инв. № КТ55524 | 13 392,00 | 669,60 | 5 |
| № 55 | Универсальный поворотный делительный стол с УЦИ4. Инв. № КТ25000 | 11 880,00 | 594,00 | 5 |
| № 56 | Фильтровентиляционный агрегат ФВА 1200УК передвижной. Инв. № КТ50000279 | 2 052,00 | 410,40 | 20 |
| № 57 | Машина трубогибочная мод. ИВ3429. Инв. № КТ49405 | 5 508,00 | 550,80 | 10 |
| № 58 | Пресс гибочный гидравлический 2-стоечный ПГГ-2. Инв. № КТ50000257 | 1 404,00 | 280,80 | 20 |
| № 59 | Пресс гидравлический П-6328 – 6/у. Инв. № КТ50000285 | 4 968,00 | 496,80 | 10 |
| № 60 | Станок ИВ3429. Инв. № КТ50000274 | 3 348,00 | 502,20 | 15 |
| № 61 | Станок зубофрезерный 53А30П. Инв. № КТ00021075 | 6 264,00 | 501,12 | 8 |
| № 62 | Станок токарно-винторез. 1к62д. Инв. № КТ00020631 | 2 916,00 | 437,40 | 15 |
| № 63 | Токарно-винторезный станок мод. 16к20. Инв. № КТ01520314 | 5 616,00 | 561,60 | 10 |
| № 64 | Токарно-винторезный станок мод. 16ВТ20П-21. Инв. № КТ55534 | 13 392,00 | 669,60 | 5 |

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 5(пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу затраты по оплате вознаграждения Организатору аукциона посредством заключения соглашения о возложении обязанности между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 29.11.2018 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи», проводимом 29 ноября 2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 27.11.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57,8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 28 ноября 2018 г. проводит открытый аукцион с условиями № 13-У-18 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на трех земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, в границах ул. Прилукская – пер. Окрестина 1-й | 0,8524 | Для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения в границах ул. Прилукская – пер. Окрестина 1-й» | 294 739,46 | 44 000,00 | 14 063,44 | Отселение и снос попадающих под пятно застройки жилых и нежилых строений по ул. Азовской, д. 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 9, 10 | 2 164 972,06, а также затраты по отселению жильцов с 88 кв. м государственного жилищного фонда |
| 2 | г. Минск, ул. Надеждинская (участок № 2) | 0,6836 | Для строительства объекта «Административный комплекс с паркингом по ул. Надеждинской» | 368 343,60 | 55 000,00 | 9 850,64 | Отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Надеждинской, 36, 38, 40, 42, попадающих под пятно застройки | 940 800,00 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 10 763,25 руб.* |
| 3 | г. Минск, ул. Надеждинская (участок № 3) | 0,65 | Для строительства объекта «Административный комплекс с паркингом по ул. Надеждинской» | 350 238,94 | 52 000,00 | 10 783,49 | Отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Надеждинской, 44, 46, 46А, 48, 50, попадающих под пятно застройки | 949 729,57 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 13 595,58 руб.* |

*Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету, а также актуализации с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения и соответствующего уровня инфляции.

Возмещение убытков и потерь сельскохозяйственного производства производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **28 ноября 2018 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 23 ноября 2018 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК АКВВ BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляется:**

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу:**

**г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 24 октября 2018 г. по 23 ноября 2018 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

– внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

**единственный участник несостоявшегося аукциона также в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обязан выполнить условия, предусмотренные в указанном решении, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения) Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by**

# СТРАСЦІ ПА «ЛІСТАПАДЗЕ»

## Самая гарачая тэма другой прэс-канферэнцыі Мінскага кінафестывалю

**Калі раней Мінскі кінафестываль успрымаўся мной выключна як «свята, што заўсёды з табой», сёння я бачу ў ім не толькі натхненне, але і сумненні. З аднаго боку, праграмныя дырэктары на прэс-канферэнцыі называюць імёны, на якія хочацца бегчы набываць білеты, як толькі яны трапяць у продаж — Карлас Рэйгадас, Ларс фон Трыер, Сяргей Лазніца, Нуры Більге Джэйлан, Брыянтэ Мендоса, Аньес Варда і іншыя. З іншага боку, каардынатар Нацыянальнага конкурсу падбірае словы, каб апісаць сёлетні «эксперымент».**

Сёлета рашэнне па змесце праграмы беларускіх фільмаў прымала камісія пры Міністэрстве культуры, у якой не было прадстаўнікоў дырэкцыі «Лістапада». Пытанне ў тым, ці не скажацца гэты эксперымент негатыўна на статусе і прэстыжы кінафестывалю і пастаяннай акрэдытацыі FIAPF — Міжнароднай федэрацыі асацыяцый кінапрадзюсараў. У кінаасяроддзі ў сеціве нават прагучаў заклік да байкоту Нацыянальнага конкурсу, нехта падзяліўся, што сёлета наўмысна не падаваў на яго заяўку з-за недаверу да прынцыпаў адбору.

«Увогуле, гэта праблема, — кажа дырэктар «Лістапада» Анжэліка Крашэўская. — Згодна з адным з пунктаў міжнароднага рэгламенту, кінафестываль павінен быць па-за цэнзурным кантэкстам. Інакш ні ў адной краіне свету з яе ідэалагічным разуменнем — а ў кожнага свае погляды на палітыку — немагчыма будзе правесці міжнародны фестываль. Сёння я нічога не магу сказаць — мы будзем даваць справаздачу FIAPF па выніках года. Канешне, усё гэта (маецца на ўвазе сітуацыя з Нацыянальным конкурсам. — **Аўт.**) не на карысць фестывалю. У гэтым годзе мы сутыкнуліся з яшчэ адной сітуацыяй — быў аб'яўлены тэндар (конкурс на арганізацыю і правядзенне 25-га «Лістапада». — **Аўт.**). Гэта таксама па-за рэгламентнымі патрабаваннямі, згодна з якімі дырэкцыя павінна быць пастаяннай. Мы пра гэта гаворым ужо дзевяць гадоў. Ёсць маса вельмі вострых пытанняў, і я не ведаю, як іх вырашаць і як дзейнічаць».




Узніклую размову пра статус «Лістапада» і ўмовы фарміравання Нацыянальнага конкурсу працягнула першы намеснік міністра культуры Ірына Дрыга, якая на прэс-канферэнцыі прадстаўляла ўласна аднаго з заснавальнікаў кінафестывалю (ні для каго не сакрэт, што вялікую частку сродкаў на арганізацыю «Лістапада» выдаткоўвае Міністэрства культуры): «Ёсць патрабаванне заканадаўства, якое датычыцца бюджэтнага фінансавання і падтрымкі праектаў. Пакуль гэтае заканадаўства аб дзяржаўных закупках дзейнічае, адпаведна існуе і сістэма тэндара — іншага ў гэтай сітуацыі не дадзена. Што датычыцца Нацыянальнага конкурсу, я б не стала наўмысна згушчаць фарбы, таму што рэкамендацыі, якія дала дырэкцыя, камісія разглядала і ўлічвала. Адзінай мэтай было зняць пэўнае напружанне, што існуе ў кінаасяродку ў адносінах да, скажам так, адбору. Чаму нехта трапляе ў конкурс, а нехта не трапляе? Такая практыка дзейнічае не першы год, і зараз рабіць з гэтага сенсацыю не бачу ніякіх прычын».

Так ці інакш, мэта і дасягненні «Лістапада», што датычацца беларускага кіно, застаюцца неаспрэчнымі. З самага пачатку існавання Нацыянальнага конкурсу «Лістапад» штогадова прадстаўляе найбольш цікавыя работы айчынных аўтараў, фарміруючы такім чынам пэўны вобраз беларускага кіно. Важна таксама, што яго ацэньвае міжнароднае журы, у якое запрашаюцца прафесіяналы, што маюць дачыненне да дыстрыбуцыі і фестывальнага руху. Гэта значыць, у конкурсе яны могуць нешта ўпадабаць і даць гэтаму ўваход на іншыя міжнародныя пляцоўкі. А калі не — аб'ектыўна ацаніць работы з пункту гледжання сучасных тэндэнцый і запытаў кінасферы.

«Гэта пляцоўка, дзе беларускае кіно паказваецца не толькі гледачу, але і міжнародным прафесіяналам. Фільмы, якія ўдзельнічалі ў Нацыянальным конкурсе, працягваюць сваё падарожжа па міжнародных кінафестывалях у іншых краінах», — кажа каардынатар Нацыянальнага конкурсу Мікалай Лаўранюк. Сёлета ў журы ўвайшлі тры жанчыны — фестывальны агент з Францыі Паскаль Рамонда, адборшчык праграмы «Дні аўтараў» Венецыянскага кінафестывалю Рэната Сантора і беларуска Дар'я Юркевіч, рэжысёр.

Нацыянальны конкурс 25-га «Лістапада» ўключае сем ігравых, восем дакументальных і пяць анімацыйных карцін. Сярод іх ужо вядомы гледачам «Хрусталь» Дар'і Жук, што трапіў у лонг-ліст кінапрэміі «Оскар», фільм Мары Тамковіч «Дачка», што не так даўно быў прадстаўлены ў кінапракаце «СВАЁ КІНО», створаны на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» альманах «Вайна. Застацца чалавекам». Тут жа кароткаметражны «Ягор», зняты купалаўцамі па матывах кнігі «Радзіва «Прудок» Андруся Горвата. Дакументальная частка прадстаўлена работамі Галіны Адамовіч, Евы-Кацярыны Махавай, Аляксандра Свішчанкова і іншых. У анімацыйнай секцыі — Ігар Волчак, Таццяна Кубліцкая, Марына Карпава і іншыя аніматары.

Пазаконкурсных паказаў беларускіх фільмаў гэтым разам не будзе. Дарэчы, заявак на Нацыянальны конкурс было пададзена 87. Паказы пройдуць з 6 да 8 лістапада ў кінатэатры «Беларусь».

Іншыя навіны з кінафестывалю «Лістапад» шукайце ў наступных нумарах газеты, а таксама на нашым сайце zviazda.by.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

■ Сугучча

# Радасць чытання — у Бялградзе

**На 63-м Бялградскім міжнародным кніжным кірмашы ў Сербіі прадстаўлена і экспазіцыя беларускіх кніжных навінак.**

Удзел у прэстыжным форуме кнігагандляроў, выдаўцоў, паліграфістаў, пісьменнікаў у складзе дэлегацыі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь прымаюць дырэктар паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа Ігар МАЛАНЯК, дырэктар выдавецтва «Народная асвета» Вікторыя КАЛІСТРАТАВА, намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей ЧАРОТА, паэт Віктар КАЖУРА.

— Не ўпершыню прыязджаю на кніжны кірмаш у Бялград, — расказвае нашаму карэспандэнту перакладчык Аляксей Чарота, — і заўсёды ўражваюся шматаблічнам кніжнага асартыменту, радуюся за сербскіх пісьменнікаў, якім гэтулькі магчымасцяў дадзена ў справе выдання сваіх твораў. Здзіўляюся багаццю перакладной літаратуры. Бачу, як шмат перакладаюць рускую літаратуру. У тым ліку з'яўляюцца і новыя пераклады класічных твораў. Спадзяюся, што той грунт, які ўмацоўваецца ў беларуска-сербскіх літаратурных адносінах некалі дасць болей шырокі вынік і ў выданні кніг беларускіх аўтараў на сербскай мове.

Удзел у адкрыцці стэнда Рэспублікі Беларусь прынялі саветнік пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Сербія Міхаіл КАЖУРА, намеснік міністра культуры і інфармацыі Сербіі Ася Драча МУНТЭАН, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Рэспубліцы Сербія Аляксандр АЛЕКСАНДРОВІЧ, былы пасол Сербіі ў Беларусі Срэчка ДЖУЦІЧ і іншыя госці, сербскія літаратары. Паэт Віктар Кажура чытаў вершы сербскіх паэтаў. Аляксей Чарота расказаў пра публікацыі сербскіх аўтараў у Беларусі, найперш — на старонках літаратурна-мастацкай перыёдыкі: у часопісах «Нёман», «Полымя», «Маладосць», іншых выданнях. Дарэчы, дэвізам правядзення чарговага міжнароднага кніжнага кірмашу ў Бялградзе з'яўляюцца наступныя словы: «Радасць чытання». У Беларусі яшчэ часам гавораць і так: «Чытанне кніг — найлепшая асалода». Гэтае выказванне таксама неаднойчы гучала падчас адкрыцця беларускага стэнда.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

■ Zамор'е

## СПАЛОХАЎСЯ ВЫШЫНІ І ЗАСТАЎСЯ БЕЗ НЯВЕСТЫ

**23-гадовая кітаянка Сяа Цзін у канцы лета сабралася замуж за свайго хлопца, з якім сустракалася тры гады, але яе турбавала, што будучы муж даволі баязлівы.**



Справа ў тым, што малады чалавек панічна баіцца вышыні. Дзяўчына вырашыла, што дзеля яе бойфрэнд пакончыць з ненавіснай ёй баязлівасцю, а таму наладзіла яму незвычайную прапанову (сама!) рукі і сэрца.

Дзяўчына ў вясельнай сукенцы загнала на шкляны мост новы пазадарожнік, паставіла на капот набіты грашыма чамадан (з сумай, эквівалентнай 14 500 доларам) і прапанавала хлопцу сябе і пасаг, калі ён пераадолее свой страх — пройдзе па мосце. Выявілася, што бойфрэнд, якога ненадакучліва да месца прапановы прывялі сябры, да такога павароту не гатовы. Праўда, ён паспрабаваў адолець сваю фобію, але ў выніку плюнуў і сышоў, назваўшы сваю нявесту бездказнай.



Сяа ў слязах паведаміла журналістам, што абавязкова развітаецца са сваім хлопцам. Прапанова выглядала настолькі паказушна, што многія вырашылі, быццам гэта рэкламны трук. Але адміністрацыя моста адмяла падазрэнні ў пастаноўцы, заявіўшы, што гэта месца часта выкарыстоўваюць для прапаноў рукі і сэрца, і яе супрацоўнікі проста дапамаглі ўсё арганізаваць, як для любых іншых кліентаў.

## МАЛПЫ ЗАКІДАЛІ МУЖЧЫНУ ЦЭГЛАЙ

**Група малпаў закідала цэглай 72-гадовага мужчыну ў Індыі, паведамляе Sky News.**



Яны сталі кідаць у яго будаўнічыя матэрыялы, калі той прыйшоў у лес па ламачча. Пажылы чалавек памёр у бальніцы ад траўмаў галавы і грудзей. Як расказалі ў паліцыі, жывёлы сабралі цэглу ў разбураным будынку і зацягнулі на дрэвы. Яны скінулі на мужчыну больш за 20 штук. Сям'я загінулага падала афіцыйную заяву ў праваахоўныя органы. «Гэтыя малпы-ашуканцы — сапраўдныя злачынцы і павінны расплачвацца», — растлумачыў яго брат. Вартавыя парадку адзначылі, што не могуць завесці справу супраць жывёл. Жыхары вёскі, блізу якой гэта адбылося, не раз скардзіліся на варожа настроеных малпаў, але звяры знаходзяцца пад абаронай уладаў як асабліва ахоўныя віды.

У Індыі малпы часта нападаюць на жыхароў, як правіла, вінаватымі аказваюцца макакі-рэзусы.

## ІНТЭРНЭТ — МЕСЦА ДЛЯ МУЖЧЫН?

**Большасць карыстальнікаў інтэрнэту з'яўляюцца мужчынамі, а ў некаторых краінах жаночая аўдыторыя сеціва ўдвая меншая за мужчынскую. Пра гэта сведчаць вынікі даследавання арганізацыі Inclusive Інтэрнэт Index, якія публікуе The Guardian.**

Мужчыны маюць магчымасць карыстацца інтэрнэтам у сярэднім на 33,5 % часцей, чым жанчыны. У асноўным гэта звязана з абмежаваннямі, з якімі жанчыны сутыкаюцца ў многіх краінах: немагчымасць атрымаць адукацыю альбо працаваць, нізкая заробатная плата. Жыхары індыйскага Нью-Дэлі або філіпінскай Манілы, напрыклад, упэўнены, што кантэнт, спажываны ў сетцы жанчынамі, неабходна кантраляваць і абмяжоўваць. Дзве траціны з іх лічаць, што жанчыны не павінны наведваць інтэрнэт-кафэ. Кіраўнік даследаванняў у арганізацыі Web Foundation Данарай Такур перакананы, што калі ў сям'і будзе ўсяго адзін тэлефон, то, хутчэй за ўсё, ён патрапіць у рукі мужчыны. «У чалавека можа быць адзіны тэлефон у доме, таму ў жанчын няма доступу», — заключае ён.

Яшчэ адным фактарам з'ўляецца высокі кошт падключэння. Эксперты профільных арганізацый упэўнены, што маламаёмасныя пачнуць цікавіцца доступам у сеціва толькі ў тым выпадку, калі кошт доступу ўпадзе да двух працэнтаў ад іх штомесячнага даходу.

**Іван КУПАРВАС.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ПАСАДЗІЦЕ Ў САДЗЕ ІРГУ — НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

Дзякуючы выдатнай зімаўстойлівасць, непераборлівасці, багатаму плоданашэнню, ўстойлівасці да шкоднікаў і хвароб, ды і проста дэкаратыўнасці ў любую пару года ірга вартая ўвагі садаводаў, асабліва ў халодных кліматычных зонах.

Яна здольная без праблем пераносіць маразы да мінус 50 °С, а кветкі лёгка вытрымліваюць паніжэнне тэмпературы да мінус 7 °С і пры гэтым завязваюць плады! Акрамя таго, ірга валодае хуткім ростам і дзіўнай непераборлівасцю. Калі нават вырошчваць яе проста так, аддаючы ўраджай птушынай брацii і цалкам не даглядаючы, то яна сама выдатна справіцца з жыццёвымі цяжкасцямі і ўсё роўна будзе расці, цвісці і даваць ураджай.

Ірга ў маі пакрываецца белай пенай кветкавых гронак, якія нагадваюць чаромху. Кветкі самаапыляльныя, што спрыяе штогадоваму атрыманню выдатных ураджаяў ягад незалежна ад умоў надвор'я. Улетку куст абчэплены гронкамі ягад зялёнай, чырвонай і амаль чорнай афарбоўкі адначасова. Добрая ірга і восеньскай парой, калі яе лістота афарбоўваецца ў аранжава-чырвоныя і пурпурныя тоны.

Ірга — сапраўдны доўгажыхар саду. Жыве 60—70 гадоў. Практычна не хварэе і не баіцца шкоднікаў. Найбольш у нашай кліматычнай зоне распаўсюджана ірга звычайная (або бунялісная), трохі радзей сустракаецца ірга канадская.

Ягады іргі звычайнай памерам з буйную гарошыну, цёмна-фіялетавыя, амаль чорныя, пакрытыя васковым налётам. Вельмі смачныя, салодкія, сабраны ў гронкі прыкладна па 8—12 штук. Пачынаюць спець у канцы чэрвеня, прычым не адначасова, а паступова, калі на адной гронцы ёсць і амаль чорныя, і зусім зялёныя ягадкі.

Такое расцягнутае плоданашэнне дазваляе ласавацца імі ледзь не да самай восені. Асляпляльныя бліскі такіх прадметаў добра адпужваюць птушак.

Ірга канадская вылучаецца высакаросласцю, расліны дасягаюць 6-7 метраў у вышыню. Парасткі тонкія, злёгку нікнуць, утвараюць прыгожую крону. Плады сакавітыя, далікатныя і салодкія, вельмі высокіх смакавых якасцяў.

Ірга зусім непераборлівая да складу глебы і амаль не мае патрэбы ў доглядзе. Але, як і любая расліна, цудоўна адгукнецца на рыхлую, угноеную перагноем глебу. Пры пасадцы варта памятаць, што яна святлолюбівая і ў



цені практычна не будзе пладаносіць. Маладыя саджанцы пачынаюць даваць плады ўжо ў 3-4-гадовым узросце. Ірга штогод дае шмат прыкаранёвых парасткаў, якія можна выкарыстоўваць для размнажэння. Маладыя саджанцы высаджваюць вясной ці восенню. Нягледзячы на іх сціплыя пакуль яшчэ памеры, трэба выкапаць вялікую ямку (60х60 сантыметраў), добра заправіць яе арганікай, дадаць попелу. Можна проста ўнесці мінеральныя ўгнаенні: прыкладна 150 грамаў калійных і 300 грамаў фосфарных. Высадак лепш абрэзаць прыкладна на адну траціну вышыні, гэта паспрыяе хуткаму прыросту і лепшай прыжывальнасці.

Каб не ўтварыўся велізарны высокі куст, трэба перыядычна выразаць старыя дарослыя галіны. Гэтая працэдура спрыяе пастаяннаму амаладжэнню куста і стабільнаму прыросту маладых парасткаў, бо багата пладаносяць менавіта парасткі мінулага года. Ірга наогул лёгка пераносіць стрыжку і дзякуючы хуткаму ўтварэнню новых парасткаў можа выкарыстоўвацца нават у якасці жывой загарадзі.

З-за шчодрага штогадовага плоданашэння іргі адбываецца інтэнсіўны вынас пажыўных рэчываў з глебы. Таму зусім нялішнім будзе ўнясенне перагною ў глебу ў прыкаранёвай зоне. Летам пасля плоданашэння вельмі дарэчы будуць вадкія падкормкі растворам дзіваннага ці птушынага памёту. Пры адсутнасці такіх можна выкарыстоўваць і мінеральныя ўгнаенні.

Ягады іргі не толькі маюць своеасаблівы цудоўны смак, яны багатыя на вітаміны, цукар, арганічныя кіслоты і іншыя карысныя рэчывы. Напрыклад, па колькасці вітаміну С яны перасягаюць вінаград, яблыкі, грушы, абрыкосы і персікі. Дзякуючы гэтаму з'яўляюцца эфектыўным сродкам супраць гіпавітамінозу.

Ягады іргі выкарыстоўваюцца як ласунак не толькі ў свежым выглядзе. З іх вараць варэнне, джэм, павідла, узвары, іх замарожваюць, сушаць. Прычым дзякуючы дастатковай колькасці ў складзе ягад прыродных цукроў для варэння трэба ўсяго толькі 300 грамаў цукру на кілаграм іргі. Можна адціснуць смачны сок, але ёсць адзін нюанс. Са свежасабраных ягад сок практычна не адціскаецца, але праз 7—10 дзён пасля збору яго выхад дасягае 70 %. Добра вядома, што многія ягады пасля замарозкі становяцца кіслымі, толькі не ірга! Пасля размарожвання яе плады не губляюць формы і смаку і выглядаюць так, быццам іх нядаўна знялі з галінак.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.54 | 17.53 | 9.59 |
| Віцебск — | 7.47 | 17.39 | 9.52 |
| Магілёў — | 7.44 | 17.43 | 9.59 |
| Гомель — | 7.38 | 17.43 | 10.05 |
| Гродна — | 8.08 | 18.08 | 10.00 |
| Брэст — | 8.06 | 18.12 | 10.06 |

### Месяц

*Поўня ў 19.45.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

**Пр.** *Зінаіды, Льва, Піліпа.*
**К.** *Марты, Антона, Марціна, Рафала.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 24 КАСТРЫЧНІКА




**1590** год — нарадзіўся (Гродзеншчына) Станіслаў Ягадзінскі, паэт, перакладчык. У 1613—1618 гадах вучыўся ў Віленскай акадэміі. У гэты перыяд ён пачаў пісаць вершы. У 1620-м скончыў факультэт права Кракаўскай акадэміі, затым працягваў адукацыю ў Падуанскім універсітэце. У 1624—1625 гадах падарожнічаў па краінах Заходняй Еўропы (Германія, Бельгія і Італія). З 1625-га жыў пры двары Радзівілаў у Нясвіжы, наведваў Кобрын, Жыровічы, Гродна. Рабіў для магнатаў геральдычныя знакі. У гэты час пісаў пераважна панегірыкі, у асноўным на лацінскай і польскай мовах, але ў яго творах сустракаецца шмат беларускіх слоў, зваротаў. Аўтар зборнікаў «Дваранкі», «Грош». Памёр каля 1644 года.

**1743** год — нарадзіўся (Піншчына) Рафал Юзаф Чарвякоўскі, вучоны-медык, асветнік, доктар філасофіі і медыцыны. У 1776 годзе скончыў Рымскі ўніверсітэт. Праходзіў медыцынскую практыку ў шпіталях Неапаля, Фларэнцыі, Турына, Вены, Парыжа і Берліна. У 1779-м накіраваны з Пінска ў Кракаў выкладаць медыцыну ў Галоўнай каронный школе (Ягелонскі ўніверсітэт). У час паўстання 1794 года быў галоўным лекарам лазарэта пры саборы Св. Пятра. Аўтар 12-томнай працы па арганізацыі і правядзенні хірургічных аперацый. Памёр у 1816 годзе.

**1933** год — нарадзіўся (Саратаўская вобласць) Генадзь Канстанцінавіч Сталяроў, беларускі вучоны ў галіне інфарматыкі, кандыдат фізіка-матэматычных навук. Аўтар навуковых прац па пытаннях вылічальнай тэхнікі, сістэмнага праграмнага забеспячэння. Распрацаваў першыя ў Беларусі базы даных для розных галін ведаў. Лаўрэат дзяржаўных прэмій СССР і БССР.




*Дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Адзначаецца ва ўсім свеце з 1948 года. 24 кастрычніка 1945-га ўступіў у сілу Статут ААН. Па традыцыі ў розных краінах у гэты дзень праходзяць шырокія грамадскія дыскусіі і выстаўкі, прысвечаныя абмеркаванню мэт і дасягненняў гэтай арганізацыі.*

**1795** год — у Пецярбургу падпісаная канвенцыя аб трэцім падзеле Рэчы Паспалітай. Да Расійскай імперыі далучыліся заходняя частка Беларусі, частка Літвы (да Коўна) і Курляндыя. Паўднёва-заходняя частка Берасцейскага ваяводства адыходзіла да Аўстрыі, паўночна-заходняя частка Гродзеншчыны — да Прусіі.

**1882** год — нарадзіўся Імрэ Кальман (1882—1943), венгерскі кампазітар, класік венскай аперэты.

**1935** год — на Спаскай вежы Маскоўскага Крамля ўстаноўлена першая пяціканцовая зорка. Да 1935 года (з 50-х гадоў XVII стагоддзя) шпілі крамлёўскіх вежаў упрыгожвалі геральдычныя двухгаловыя арлы. У кастрычніку 1935-га над Крамлём замест царскіх арлоў з'явіліся пяціканцовыя зоркі.



## УСМІХНЕМСЯ

**Чым большы смартфон, тым больш балюча раніцай ён падае на твар.**

Аб'ява:

«Жанаты, прыгожы, разумны мужчына хоча пераважніцца!»

**Рабская праца адрозніваецца ад дачнай толькі тым, што рабоў не кормяць шашлыком.**

— Да якога часу ты будзеш швэндацца па бабах?! У нас ужо трое дзяцей, і яшчэ ніводнага ад цябе!

**Мая бабуля была вельмі разумнай жанчынай. Ні разу не брала мяне да сябе на лета.**

— Прывітанне! Даўно не бачыліся, ты нейкі пакамечаны...

— Дык, прыкінь, жонка, зараза, здаецца, спойвае мяне! Прыходжу дадому — і кожны раз там цэлая патэльня закускі!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3787.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 кастрычніка 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12